PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2454) Год XLVIII | Беласток, 25 мая 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Духоўнасць і майстэрства

Аляксей Мароз

У час Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі", які з 11 па 18 мая адбыўся ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы (арганізатары: Грамадскі арганізацыйны камітэт і Саюз „Любіцелі царкоўнай музыкі") выступіла 29 хораў з Польшчы, Беларусі, Украіны, Расіі, Грэцыі, Сербіі і Латвіі.

На адкрыццё фестывалю прыбылі мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава, епіскап Гайнаўскі Міран, Бельскі — Грыгорый, прадстаўнікі прэзідэнта РП Аляксандра Кваснеўскага, які трымае патранат над фестывалем, урада, з міністрам замежных спраў Владзімежам Цімашэвічам. Прыехалі прадстаўнікі пасольстваў краін, з якіх прыбылі хоры. Пасля выступленняў мітрапаліта Савы і дырэктара фестывалю, мітрафорнага протаіерэя Міхаіла Негярэвіча пасол Сейма Яўген Чыквін уручыў прэміі князя Канстанціна Васіля Астрожскага сёлетнім лаўрэатам — манашкам з Сербіі і прадстаўнікам Камітэта пабудовы помніка загінуўшым вазакам. З інаўгурацыйным канцэртам выступіў Камерны хор „Дойлідства" з Гродна — мінулагодні лаўрэат.

— Царкоўны спеў — гэта самы чысты голас нашай душы, гэта малітва, якая яднае чалавека з Уседасканалым Творцам. Міжнародныя гайнаўскія дні царкоўнай музыкі ўводзяць нас у малітвенную атмасферу, што заўсёды павінна быць самым вялікім поспехам гэтага фестывалю. Важныя артызм і дасканаласць выканання царкоўнай музыкі, але яны павінны ўзнікаць з духоўнага багацця, — заявіў у час адкрыцця фестывалю мітрапаліт Сава.

„Выканаўства царкоўнай музыкі" — гэта тэма семінара, які адбыўся ў першы дзень фестывалю. Старшыня конкурснай камісіі мітрафорны протаіерэй Лявонцій Тафілюк у час даклада адзначыў патрэбу нагляду з боку Царквы за тварэннем і выканаўствам царкоўнай музыкі. З першых дзён фестывалю працавалі выстаўкі ікон, напісаных румынскай моладдзю, фатаграфій Гжэгажа Дамброўскага — „Паломнікі", Ежы Вуйціка — „Цэрквы Гайнаўскага і Кляшчэлеўскага благачынняў" і макетаў цэркваў з Польшчы і Расіі, выкананых Янам Францкевічам.

Конкурсны агляд пачаўся з выступленняў прыхадскіх хораў з Беласточчыны.

— Дзіцяча-маладзёжны хор „Рамонка" з Ласінкі выступіў як прафесійны хор. Іх спеў прасякнуты быў малітвай. Падабралі яны цікавы рэпертуар са знаменнымі і партэснымі распевамі. Вельмі высокі ўзровень прэзентаваў Дзіцяча-маладзёжны хор прыманастрыскага прыхода з Супраслі. У іх рэпертуары таксама быў знаменны распеў. Добра спяваў Цэнтральны хор прыхода з Гарадка. У параўнанні з мінулым годам павысіўся ўзровень прыхадскіх хораў, — заявіў член конкурснай камісіі, протаіерэй Георгій Мацкевіч.

Прыхадскія хоры ўмела спалучалі духоўнасць і майстэрства царкоўнага спеву.

[працяг ☞ 3]

Фота Мацея Халадоўскага

Прэзідэнт у Беластоку

Мацей Халадоўскі

Прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі пераконваў у Беластоку: — Еўрасаюз стварыў такія стандарты, якія найпаўней і найбольш паспяхова захаваюць правы нацыянальных і рэлігійных меншасцей. ЕС гэта шанц, каб тыя правы ўмацаваць на вельмі трывалым падмурку, фундаменце такіх каштоўнасцей, як павага і гонар чалавека, талерантнасць у адносінах да іншых поглядаў. Маю надзею, што польскія меншасці аддадуць свой голас за Еўрасаюз. Заклікаю да гэтага.

Прэзідэнта 13 траўня ў час перадрэферэндумнага, дзевятага аб'езду па ваяводствах суправаджалі старшыня ПСЛ Яраслаў Каліноўскі, міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч і прэсавы шэф яго Канцылярыі Дарыюш Шымчыха. Аляксандр Кваснеўскі пачаў сустрэчу ў Вышэйшай школе публічнай адміністрацыі, галоўным чынам са студэнтамі гэтае школы і навуковай кадрай вышэйшых навучальных устаноў Беластока. На пачатку заклікаў прыняць удзел і аддаць голас у еўрасаюзным рэферэндуме за „так".

— Давайце, здзейснім тыя мары, якія былі толькі марамі шматлікіх пакаленняў палякаў.

Прытым падкрэсліў:

— Пасля ўваходу ў ЕС з хвіліны на хвіліну жыццё не стане лепшым. У сапраўднасці наш уваход у Еўрасаюз будзе датычыць маладых людзей. Гэта пропуск у доўгі, але заахвочваючы працэс.

З задавальненнем прэзідэнт гаварыў аб 50 тысячах маладых людзей, якія вучацца ў пятнаццаці беластоцкіх вучэльнях:

— Ад вас будзе залежаць якасць польскай прысутнасці ў Еўропе. Добрая адукацыя — сёння пропуск у краіны Еўропы больш важны, чым замежны пашпарт.

Пераконваў:

— Народ, які выходзіў у сваёй гісторыі з найбольш складанага цяжкага становішча, не можа сказаць, што не справіцца ў еўрасаюзных структурах. Цяпер (справа ў рэферэндуме — М. Х.) патрабуем моцнага голасу. Літоўцы паказалі, што гэта магчыма.

Студэнты і ўдзельнікі сустрэчы ў ВШПА пыталіся прэзідэнта аб тым, як выйсці з цяжкага эканамічнага становішча Польшчы. Аляксандр Кваснеўскі скінуў адказы на прадстаўніка ўрада — Владзімежа Цімашэвіча, які сцвердзіў, што публічны доўг Польшчы ў параўнанні з некаторымі еўрасаюзнымі краінамі не самы высокі, тым не менш з гэтым пытаннем мусім справіцца самі, асабліва таму, што еўрасаюзныя дапаможныя сродкі галоўным чынам будуць успамагаць мясцовыя бюджэты, а не цэнтральны.

— Калі зраўняемся ў заробках з сярэднім еўрасаюзным узроўнем? — пытаўся адзін з маладых людзей.

— На гэтае пытанне няма дакладнага адказу. Вядома, што ёсць шанцы, каб рост развіцця Польшчы пасля ўваходу ў Еўрасаюз фармаваўся на ўзроўні 5% у год. За гэтым пойдзе павышэнне заробкаў, але гэта не стане хутка. Таксама і не пабольшацца да еўрасаюзнага ўзроўню і прэзідэнцкія заробкі, — адказаў прэзідэнт.

Адзін з маладых прадстаўнікоў Сусветнага фонду па справах прыроды дапытваўся пра будучыню Белавежскай пушчы. Прытым прывёў трывожныя думкі прафесар Сімоны Косак і шэрагу іншых навукоўцаў, якія датычаць небяспекі звязанай з няўхільнай стратай яе першабытнага стану. Прэзідэнт Кваснеўскі адказаў:

[працяг ☞ 3]

Фестываль адкрыты на ўсіх ☞ 2

Фестываль прытрымліваецца сваёй формулы — гэта свецкае мерапрыемства адкрытае на ўсіх, хто ў нас хоча заспяваць. Не мае тут значэння ні нацыянальнасць, ні канфесія, ні светагляд. Фестываль другі раз праводзіцца па-за храмам. Калі, аднак, царкоўная музыка з'яўляецца малітвай, дык памаліцца можна ўсюды.

Сто гадоў у пошуках сяброў ☞ 4

Беларусы ад самага пачатку шукалі сабе сяброў, з якімі хацелі б будаваць супольную дзяржаву. Найчасцей былі гэта палякі і рускія, але падчас I сусветнай вайны разважаўся таксама праект літоўска-беларуска-латышскай дзяржавы. Каталікі найчасцей змагаліся за адбудову Рэчы Паспалітай, праваслаўныя — за дэмакратычную Расію.

Славенцы ў Корашцы ☞ 5

У 1959 годзе ў Карынтыі было адменена абавязковае навучанне славенскай мовы, зводзячы яе да прадмета, навучаемага са згоды бацькоў. У 2000/2001 навучальным годзе на двухмоўнай тэрыторыі Корашкі дзейнічала 79 школ з 5 989 вучнямі, з ліку якіх у 63 школах 1 657 вучняў наведвала двухмоўныя ўрокі, а ў дзвюх школах у Цэляўцы — 113 вучняў; у 12 школах навучанне славенскай мове абавязковае.

У добрай атмасферы ☞ 9

Ліцэісты спадзяваліся, што па польскай мове могуць быць тэмы пра вайну, чалавека або сэнс жыцця. Вучняў I „а" класа абрадавала першая тэма, у якой закраналася праблема чалавечага шчасця.

Іншыя кнігі ў „Акцэнце" ☞ 9

„Акцэнт" наладзіў кантакт з фірмай „Książka Rosyjska" ў Варшаве ў справе пастаўкі ў Беласток кніг з новых каталогаў. Кнігі — з розных бібліяграфічных груп, м.інш. белетрыстыкі, паэзіі, прозы, філасофіі, гісторыі, медыцыны, літаратуры для дзяцей і моладзі, сучаснай літаратуры і класікі вялікіх майстроў, а таксама лексіконы, альбомы, ноты, кампакт-дыскі.

Новая (старая) кааліцыя ☞ 11

Падляшская народная ініцыятыва (PIL) — так называецца ад Дня перамогі новы, у пяць асоб, клуб радных „Самаабароны" ў Падляшскім сейміку. Мусіў ён перамяніць назву, паколькі не сарваў кааліцыі з СЛД-УП-ПСЛ, як гэтага хацеў ад радных „Самаабароны" ва ўсёй краіне Анджэй Лепэр.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Фестываль адкрыты на ўсіх

Гутарка з Мікалаем Бушко, дырэктарам XXII Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі — Гайнаўка 2003.

— У 2002 годзе два фестывалі, якія прысвячаюцца царкоўнай музыцы сталі фактам і гэтае пытанне, па-мойму, кожны год будзе нанава ставіцца. Хто сягоння застаўся з Мікалаем Бушко, дырэктарам XXII Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі?

— Фактычна, акрамя XXII МФЦМ адбываюцца яшчэ „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" — мерапрыемства, якому арганізатары дадаткова прыдалі назву фестывалю.

Мне здаецца, што назву можна даць, але напэўна нельга прыдаць ранг — тым больш, нельга яго прысабечыць. На гэта трэба гадамі папрацаваць.

„Гайнаўскія дні" маюць быць іншым мерапрємствам, а ў той жа момант і такім жа, хаця і хто іншы яго праводзіць. Арганізатары і апекуны „Дзён" стараюцца неяк асэнсаваць свае дзеянні ды ўключаюць у іх Гайнаўскі дом культуры, якім я з 1979 г. займаўся і з якога пасля 24 гадоў мяне звычайна выкінулі. Мінулагоднее і сёлетняе мерапрыемствы пад шыльдай „Дзён" з'яўляюцца відавочным плагіятам свецкай імпрэзы, якую я прыдумаў і з 1982 г. праводжу пад назвай Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі — Гайнаўка.

Па-мойму, надалей адбываецца адзін фестываль.

А калі ідзе пра мяне і Фестываль, дык застаюцца пры ім:

— поўнасцю экуменічнае харавое асяроддзе ў нашай краіне і замежжы,

— аматары царкоўнай музыкі, якія на працягу 21 года адукаваліся ў яе ўспрыманні і разуменні — сапраўдныя любіцелі,

— незалежныя людзі са стойкімі поглядамі, якія не паддаюцца прапагандзе,

— асобы з высокім аўтарытэтам у сваім асяроддзі, якія не баяцца ні мясцовай свецкай, ні царкоўнай улады, якая запалохвае праблемамі пры паховінах або выключэнне з царкоўнай грамады,

— нонканфармісты, якія не адказваюцца ад сваіх поглядаў, схільнасцяў і сяброўства, нават калі гэта і не аплачваецца, духоўныя і свецкія асобы, якія не падтрымліваюць некаторых дзеянняў ды якія сэрцам і душою за нашу формулу Фестывалю, хаця ад страху застаюцца лаяльнымі перад сваімі начальнікамі і іерархамі.

Да ўсіх пералічаных трэба дадаць шырокае кола сяброў Фестывалю ў нашай краіне і замежжы.

— Як мяняецца Фестываль, які другі раз праводзіцца без падтрымкі польскай Царквы і ці змена наогул адбываецца?

— Я б тут не казаў пра падтрымку, з якой і ў мінулым усяляк бывала. У гэтым годзе акрамя яе недахопу адчуваем таксама моцны ціск — сапраўдны тэрор. Царкоўнае асяроддзе пераконвае ўсіх, што якая-небудзь падтрымка МФЦМ — дзеянне супраць праваслаўя, умяшальніцтва ў яго інтарэсы, спроба разбіць і пасварыць праваслаўных. Абсурд.

Фота АНДЖЭЯ ЗГЕТА

Нягледзячы на гэта Фестываль прытрымліваецца сваёй формулы — гэта свецкае мерапрыемства адкрытае на ўсіх, хто ў нас хоча заспяваць. Не мае тут значэння ні нацыянальнасць, ні канфесія, ні светагляд. Фестываль другі раз праводзіцца па-за храмам. Калі, аднак, царкоўная музыка з'яўляецца малітвай, дык памаліцца можна ўсюды.

— Каго ў гэтым годзе пачуем?

— Знакамітых выканаўцаў. Відаць гэта, хоць і не ўсё, у праграме. Усе хоры, згодна традыцыі, выступаюць у нас упершыню.

— Фестываль заўжды быў вялікім арганізацыйным і... фінансавым мерапрыемствам. Кола яго спонсараў пашырылася, звузілася..?

— Фестываль надалей застаецца вялікім арганізацыйным і фінансавым праектам. На жаль, кола яго спонсараў цяпер іншае. Тых спонсараў, якіх мы дзесяцігоддзямі прыцягвалі і пераконвалі ў каштоўнасці Фестывалю, але якія залежаць ад палітыкі, перанялі „Дні царкоўнай музыкі". У мяне на думцы, між іншым, самаўрады і варшаўскае тэлебачанне. Апошнім часам далучылася да іх і Маршалкоўская ўправа, якая запісаныя нам ва ўрадавым кантракце для Падляшскага ваяводства сродкі (прыдбалі мы іх у 2001 г.) перадала для „Дзён", якіх у момант заключэння кантракту яшчэ не было. Тэхнічна адбылося тое дакладна так, як у мінулым годзе бурмістр Гайнаўкі перадаў гарадскія сродкі на МФЦМ для „Дзён царкоўнай музыкі".

Агульна кажучы, у гэтым годзе забракавала падтрымкі многіх устаноў і арганізацый, якія павінны яе аказваць з абавязку, але ў той жа момант з'явіліся іншыя спонсары, у якіх такога прымусу няма. Мы ім удзячныя. Мы адчуваем, што наш Фестываль вельмі мяшае ўсім прыхільнікам „Гайнаўскіх дзён царкоўнай музыкі". Яны за ўсякую цану і ўсімі даступнымі сродкамі хочуць наш Фестываль знішчыць. Паводле іх, нягледзячы на якаснасць і формулу, фестываль павінен быць адзін — царкоўны і адзінаслушны.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр МАКСІМЮК

„Небяспечныя" няўрадавыя арганізацыі

Праяўляць грамадзянскую актыўнасць у Беларусі становіцца ўсё цяжэй. Асабліва калі гэтая актыўнасць не ўпісваецца ў рэчышча мацуемай дзяржаўнай ідэалогіі, у якой усе астатнія погляды на рэчаіснасць лічацца не толькі памылковымі, але і шкоднымі. Апошнім часам над чатырма грамадскімі няўрадавымі аб'яднаннямі дэмакратычнай накіраванасці навісла пагроза ліквідацыі.

Міністэрства юстыцыі заўважыла ў дзейнасці гродзенскай „Ратушы", баранавіцкай „Варуты", гомельскіх „Грамадзянскіх ініцыятыў" і агульнарэспубліканскага „Маладзёжнага хрысціянска-сацыяльнага саюза" такія грубыя і сістэматычныя парушэнні дзеючага заканадаўства, што палічыла за лепшае звярнуцца ў суд, каб той забараніў існаванне арганізацый-парушальніц. Асноўныя прэтэнзіі заключаюцца не ў тым, што гэтыя структуры, напрыклад, пад выглядам адукацыйна-асветніцкай дзейнасці зацягвалі ў рознага кшталту таталітарныя рэлігійныя секты неразумных падлеткаў, ці разам са сваімі інфармацыйнымі бюлетэнямі распаўсюджвалі пакецікі з гераінам ці марыхуанай, альбо друкавалі на сваіх прынтэрах і рызографах разнастайную нахабшчыну, расклейваючы потым яе на ўсіх гарадскіх слупах. Не, справа не ў гэтым, бо гэтага не было і не магло быць увогуле. Вышэйзгаданыя арганізацыі „груба і сістэматычна" праштрафіліся за тое, што парушылі правілы напісання пратаколаў, не так як лічыцца неабходным вялі справаводства, ну і, зразумела, парушалі ўласныя статуты, праводзячы агітацыйна-масавую работу сярод насельніцтва і прымаючы актыўны ўдзел падчас выбарчых кампаній. Да асабліва грубых парушэнняў адносіцца нямэтавае выкарыстанне паліграфічнай тэхнікі. Напрыклад „Ратуша", друкавала малымі тыражамі кніжкі мясцовых аўтараў, а потым іх бясплатна распаўсюджвала. Але нават спыніўшы пасля папярэджання летась „такое беззаконне" яна парушыла правілы захоўвання ўласнага рызографа, за што і мусіць знікнуць.

Варта адзначыць, што вышэйпамянёныя арганізацыі не толькі імкнуцца сваёй актыўнасцю да ўсталявання ў Беларусі грамадскай супольнасці, бо, з'яўляючыся так званымі рэсурснымі цэнтрамі, падахвочваюць да праяўлення ініцыятывы асобных грамадзян і іншыя слабейшыя арганізацыйна аб'яднанні, але і прываблiваюць у свае шэрагі моладзь, якая адчувае сваю адказнасць за справы ў дзяржаве і адначасова не ёсць прыхільніцай дзеянняў сённяшніх беларускіх улад. Шчыра кажучы, гэта той сектар беларускага грамадства, якое вызнае апазіцыйныя погляды. На падтрымку яе часцяком накіроўваюцца сродкі з розных фондаў, у першую чаргу, замежных. Тут няма нічога страшэннага і проціпраўнага, бо такая практыка існуе ва ўсіх цывілізаваных краінах, дзе ўсталявана адкрытае грамадства і грошы на рэалізацыю сваіх праектаў, пры адсутнасці сродкаў у роднага ўрада, можна знайсці ў замежнага спонсара, які выдаткуе іх, калі палічыць мэты заяўляльнікаў вартымі ўвасаблення. Пра адзін з апошніх планаў выдзялення пэўнай сумы на станаўленне дэмакратыі і грамадзянскай супольнасці распавядаецца ў Акце аб дэмакратыі ў Беларусі, што разглядаецца цяпер амерыканскім парламентам. Арганізацыі, што зарэкамендавалі сябе актыўнымі і вартымі даверу, зразумела, маюць найбольшы шанц на атрыманне грашовай падтрымкі. А сярод такіх — усе вышэйпамянёныя. У гэтым бачыцца асноўная прычына ўзнікшай патрэбы з боку ўлады ў іх закрыцці.

Але кожнае дзеянне выклікае супрацьдзеянне. У абарону пакрыўджаных выступаюць іншыя няўрадавыя грамадскія аб'яднанні, абвесціўшы аб пачатку правядзення кампаніі „Наша салідарнасць". Разам, як гаворыцца ў прымаўцы, лягчэй і бацьку біць. Хто ведае, можа гэтая акцыя адродзіць у беларускім грамадстве так званае „пачуццё локця" і размовы аб раз'яднанасці дэмакратычных сіл застануцца ў мінулым.

Да пратэсту далучыліся і 24 польскія няўрадавыя арганізацыі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Прадпрымальніцкі праект

Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь у рамках сваёй Інтэрнэт-старонкі www.bialorus.pl развівае праект супрацоўніцтва беларускіх і польскіх прадпрыемстваў, галоўным чынам з Беласточчыны і Гродзеншчыны. Дзеянні Цэнтра не зводзяцца адно да прэзентацыі каталогу прадпрыемстваў, якія шукаюць замежнага партнёра, але ў супрацоўніцтве з Фондам імя Льва Сапегі ў Гродне арганізуе паездкі беластоцкіх прадпрымальнікаў у Беларусь ды знаёміць прадпрымальнікаў Беларусі з рэаліямі Беласточчыны. Адна з такіх паездак адбылася 7 і 8 мая г.г. — беластоцкая група наведала Гродна.

Многа месца ў ходзе візіту было адведзена знаёмству са Свабоднай эканамічнай зонай (СЭЗ) „Гроднаінвест" — удзельнікі сустрэліся з намеснікам кіраўніка Зоны Аляксандрам Палішчуком. СЭЗ „Гроднаівест" узнікла ў 2002 г. і фактычна толькі пачынаецца ў ёй разгортвацца дзейнасць. Зона адзначаецца шэрагам льготаў у коштах камунальных паслуг, аблягчэннямі ў рэгістрацыі фірмаў ды фіскальнымі (дэталёвую інфармацыю можна знайсці па адрасе www.invest.grodno.by). Ёсць аднак і строгія патрабаванні ад інвестараў, якія захочуць льготамі пакарыстацца — трэба, між іншым, 60% вытворчасці накіраваць за межы Рэспублікі Беларусь (прычым былыя рэспублікі СССР — таксама замежжа). Польскія прадпрымальнікі перш за ўсё цікавіліся стабільнасцю беларускага заканадаўства і банкавай інфраструктурай.

З беларускім заканадаўствам унутры СЭЗ і вонкі яе знаёміў таксама Франц Мамуль — старшыня Гродзенскага клуба прадпрымальнікаў. З неафіцыйных выказванняў беластоцкіх прадпрымальнікаў усё ж вынікае, што недавер да стабільнасці беларускіх законаў — галоўная праблема беларускай эканомікі ў прыцягненні замежных інвестараў. Навошта тут прамы рэкет, — аргументавалі ў прыватных размовах прадпрымальнікі, — пры такім безлічы адміністратыўных указанняў і рэгламентацый, якія часамі нават супярэчаць адно аднаму, інвестара можна беспраблемна выдойваць у святле законаў — праверкамі і штрафамі.

Адзін дзень візіту ў Гродне быў цалкам прысвечаны сустрэчам з мясцовымі прадпрымальнікамі і прыватным сустрэчам з імі. Вось гэты момант, як мне здалося, і самы вырашальны ў завязванні новых кантактаў. У выніку візіту гродзенскіх прадпрымальнікаў на Беласточчыне ў снежні 2002 г. завязалася супрацоўніцтва паміж гайнаўскай фірмай „Runo" і гродзенскай „Biotest", якія займаюцца перапрацоўкай зёлак у лекавыя прэпараты. Значыць, за ўсімі гэтымі Інтэрнэт-каталогамі, спісамі і ўзаемнымі візітамі ёсць і рэальныя кантакты ды вынікі ад іх.

Аляксандр МАКСІМЮК

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хор музыкі Візантыйскай царквы Тэалагічнага аддзялення Універсітэта ў Афінах

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дзяржаўны хор імя Г. Цітовіча з Мінска

Духоўнасць і майстэрства

[1 ☞ працяг]

У параўнанні з мінулым годам яны амаладзіліся, што было бачна на прыкладзе хораў з Белавежы, Гайнаўкі, Бельска, Беластока і Варшавы.

— Мы спяваем дзеля малітвы. Харысты нашы прыходзяць на штодзённыя багаслужэнні і сустракаюцца на спеўках. Цешыць вялікая колькасць дзяцей і моладзі ў нашым хоры, — сказаў настаяцель прыхода Нараджэння Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы, протаіерэй Леанід Шэшка.

Паспяхова спявалі харысты Праваслаўнага прыхода Апекі Маці Божай з Паддубцаў (Украіна). У асобнай катэгорыі выступалі хоры праваслаўнага духавенства Варшаўска-Бельскай і Люблінска-Холмскай епархій, Ардынарыята Войска Польскага ў Варшаве, манашак Манастыра св.св. Марфы і Марыі на Грабарцы, камерны хор „Іхос" Цэнтра праваслаўнай культуры ў Беластоку, Хор інжынерных войск пры Смаленскай пустэльні св. Засімы (Расія) і мужчынскі хор „Канон" з Масквы. Адметнасцю ў гэтай катэгорыі стаў Народны маладзёжны хор „Вяснянка" Дзяржаўнай педагагічнай калегіі з Гродна, для якога царкоўная музыка гэта толькі частка рэпертуару.

— Фестываль царкоўнай музыкі для нас — другая Пасха, свята праваслаўнай малітвы, праваслаўнай песні, — сказаў дырэктар фестывалю, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч.

Высокі ўзровень спеву прэзентавалі харысты з Мінска, Рыгі, Гродна, Санкт-Пецярбурга, Ніша (Сербія), Роўнага і Драгабыча (Украіна), выступаючыя ў катэгорыях прыхадскіх замежных і акадэмічных хораў. Выступілі таксама два прафесійныя хоры — Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча з Мінска і Хор музыкі Візантыйскай царквы Тэалагічнага аддзялення Універсітэта ў Афінах. У астатняй катэгорыі перамог Дзяржаўны хор імя Г. Цітовіча з Мінска, які заваяваў Гран-пры і стаў лаўрэатам сёлетняга фестывалю.

Конкурсная камісія першую ўзнагароду сярод прыхадскіх вясковых хораў прысвоіла Дзіцяча-маладзёжнаму хору „Рамонка" з Ласінкі. Спецыяльную ўзнагароду ў гэтай катэгорыі атрымаў хор Праваслаўнага прыхода Апекі Маці Божай з Паддубцаў (Украіна). Сярод прыхадскіх гарадскіх хораў першае месца заняў Маладзёжны кафедральны хор „Аксіён" прыхода св. Мікалая з Беластока, а спецыяльную ўзнагароду атрымаў Дзіцяча-маладзёжны хор прыманастырскага прыхода з Супраслі. У катэгорыі замежных прыхадскіх гарадскіх хораў першае месца прызялілі Маладзёжнаму кафедральнаму хору прыхода Пятра і Паўла з Мінска (Беларусь), а спецыяльную ўзнагароду — Дзіцяча-маладзёжнаму хору Іаана Дамаскінскага з Санкт-Пецярбурга (Расія). З ліку іншых хораў першае месца заняў Хор інжынерных войск, які дзейнічае пры Смаленскай пустэльні св. Засімы (Расія), а спецыяльную ўзнагароду атрымаў хор Жаночага манастыра св.св. Марфы і Марыі са Святой Гары Грабаркі. У катэгорыі акадэмічных хораў раўнапраўныя першыя месцы занялі Маладзёжны народны хор „Вяснянка" з Гродна (Беларусь) і Хор Педагагічнага універсітэта „Гаўдэамус" з Драгабыча (Украіна). Сярод іншых вылучаных і ўзнагароджаных хораў апынуўся Хор музыкі Візантыйскай царквы Тэалагічнага аддзялення Універсітэта ў Афінах (Грэцыя). Узнагароджаныя хоры выступілі ў час гала-канцэртаў у Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы і Беластоцкай філармоніі.

Аляксей Мароз

Прэзідэнт у Беластоку

[1 ☞ працяг]

— У Еўрасаюзе ёсць шанц для ўсіх нацыянальных заказнікаў. Прырода ў ЕС — адзін з самых важных прыярытэтаў. Беласточчына напэўна можа ганарыцца Белавежскай пушчай, зубрамі ды зуброўкай.

Гэтае сцвярджэнне моладзь прыняла апладысментамі.

Міністр Цімашэвіч дадаў:

— Пры сённяшнім узроўню свядомасці, Белавежскай пушчы нічога не пагражае. У ЕС будзе можна карыстацца праектам, які прыверне ёй першабытны характар, бо сёння натуральны стан захоўвае толькі 10 працэнтаў яе тэрыторыі. Рэшта падвяргнулася ўздзеянню чалавека.

Аб шанцах Падляшскага ваяводства прэзідэнт гаварыў:

— Рэгіёны гаспадарча слабыя, як Падляшша, выйграюць на ўваходзе ў ЕС. Так было ў Іспаніі ці ў Італіі, дзе бачыліся аграмадныя адрозненні паміж поўначчу і поўднем. У ЕС вельмі развінута рэгіянальная падтрымка. Да такога ўзроўню, што варшаўская агламерацыя зможа разлічваць на намнога меншую дапамогу, чым Падляшша.

Аляксандр Кваснеўскі спаслаўся на актуальную сітуацыю ў свеце:

— Пасля II сусветнай вайны ёсць дзве апоры стабільнасці: ЗША і Еўропа. Небяспечнай і фальшывай дылемай для Польшчы ёсць выбар: ці Амерыка, ці Еўропа. Амерыка Еўропе патрэбная. Дылема, каго кахаеш больш, бацьку ці маці — непедагагічная.

Пенсіянерам Аляксандр Кваснеўскі нічога не хацеў абяцаць:

— Сам уваход у Еўрасаюз у іх сітуацыі нічога не зменіць. Сацыяльная палітыка — унутраная справа паасобных дзяржаў. Еўрасаюз у гэта не мяшаецца. Трэба тут разлічваць на эканамічныя магчымасці польскай дзяржавы. Мы — краіна, якая яшчэ разжываецца. Тут найважнейшае пабольшванне нашага валавога прадукту брута, а затым магчымасці развіцця нашай краіны і ўзросту сацыяльных павіннасцей, для прыкладу, пенсійных і рэнтавых.

На канец сустрэчы ў ВШПА ўгару ўзляцелі шары з еўрасаюзнымі зорачкамі. Спаглядаючы на іх прэзідэнт шматзначна пажартаваў:

— Не заўсёды трэба штосьці страціць, каб мець.

У час прэс-канферэнцыі, прэзідэнт, спасылаючыся на сітуацыю ў польскай вёсцы падкрэсліў:

— Ці ўвойдзем мы ў Еўрасаюз, ці не, мусім мадэрнізаваць нашу сельскую гаспадарку. Польскія сяляне — адзіная прафесійная група, якая атрымае еўрасаюзную падтрымку. У снежні 2004 года будуць непасрэдныя даплаты. У Падляшскім ваяводстве сярэдняя велічыня гаспадарак гэта 14 гектараў, значыць, сума даплат не будзе малая. Гэта шанц для развіцця гэтых гаспадарак, на пабольшанне іх канкурэнтаздольнасці, але і на сацыяльную дапамогу для шмат якіх сялян, у якіх фінансавыя праблемы. Сяляне гэта група, якая павінна глянуць з аптымізмам на нашу еўрасаюзную будучыню, таму што скарыстае на гэтым канкрэтна і ў спосаб ужо гарантаваны ва Уваходным трактаце.

У час пазнейшай сустрэчы з жыхарамі Беластока, да прэзідэнта, які прамаўляў са спецыяльнай трыбуны пад палацам Браніцкіх, даляцелі гукі свісткоў групы Лігі польскіх сем'яў.

— Калі гэта ўвесь ваш высілак на „не", то ідзе ён у свісток, — каментаваў гэтыя паводзіны прэзідэнт.

Сустрэчу ў Беластоку спынілі бура ды градабой. Прэзідэнт прабаваў яшчэ пераконваць да Еўрасаюза беластачан з балкона, але надвор'е ўдачна прагнала жыхароў падляшскай сталіцы. На канец траўня ці на пачатку чэрвеня да ЕС мае пераконваць на Падляшшы прэм'ер Лешак Мілер.

Мацей Халадоўскі

Прэзідэнт РП Аляксандр Кваснеўскі сказаў у размове з „Нівай":

— Якая павінна быць роля Польшчы пасля ўваходу ў Еўрасаюз у адносінах да ўсходніх суседзяў, а перш за ўсё Беларусі?

— Наша канцэпцыя наконт усходняй палітыкі наступная. Па-першае: нельга адвярнуцца спінай да гэтых партнёраў на Усходзе, якія не ўвойдуць у Еўрасаюз. Па-другое: мусіць гэта быць палітыка актыўная, прыязная для эканамічнага супрацоўніцтва і міжчалавечых кантактаў, для гаспадарчай дзейнасці, культурнага супрацоўніцтва, павінна быць добра арганізаванае супрацоўніцтва і прыгранічны абмен. Хочам быць той краінай у ЕС, якая сур'ёзна дзейнічае дзеля ўключэння і збліжэння з Украінай ці Беларуссю, а і Расійскай Федэрацыяй, у якое ёсць свае, да таго вельмі моцныя кантакты з большасцю краін Еўрасаюза, у еўрасаюзныя структуры. Вядома, усё гэта з умовай, што будзе яно адплачана ўзаемнасцю адпаведнай палітыкі з боку нашых партнёраў. Калі справа з Украінай, у нас няма ніякіх сумненняў, таму што адтуль плывуць ясныя праеўрапейскія дэкларацыі. А з Беларуссю справа больш складаная. Але гэта не мяняе нашай канцэпцыі: хочам быць вельмі сур'ёзным партнёрам дзеля ўключання гэтых дзяржаў у садзейнічанне з ЕС і Паўночнаатлантычным пактам.

— Ці пасля ўваходу Польшчы ў ЕС патрэбны будзе закон аб нацыянальных меншасцях, які польскі парламент не можа прыняць ужо ад 13 гадоў?

— Наш уваход у Еўрасаюз у нейкім сэнсе вычэрпвае нашы чаканні звязаныя з законам аб нацыянальных меншасцях. Мусім выконваць усе еўрапейскія стандарты ў гэтай меры. А кажуць яны не толькі аб самай павазе для меншасцей, але і аб стварэнні ўмоў для навучання нацыянальнай мовы, утрымання сеткі школ у асяроддзях з адпаведнай шчыльнасцю насялення нацыянальнымі меншасцямі, навучання гісторыі і культуры, такіх выбарчых правілах, якія палягчаюць прысутнасць прадстаўнікоў меншасцей як і ў парламенце, так і самаўрадавых структурах. Уваходзячы ў Еўрасаюз, мусім выконваць гэтыя стандарты. Няма ў мяне гатовага адказу, але, вось, так цяпер задумоўваюся, ці такі закон пасля ўваходу Польшчы ў ЕС увогуле быў бы патрэбны.

— Значыць, не быў бы такі закон патрэбны?

— Цяпер не адкажу на гэта пытанне. Трэба было б гэта праверыць.

(гутарыў мах)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У сустрэчы прынялі ўдзел міністр Владзімеж Цімашэвіч (стаіць), намеснік ваяводы Ежы Паўяновіч (справа) і стараста Уладзімір Пятрочук (злева ад міністра)

У Гайнаўцы пра інтэграцыю

Павятовае староства ў Гайнаўцы арганізавала інфармацыйную сустрэчу пад лозунгам „Гайнаўская зямля ў Еўропе сёння і заўтра", якая тычылася ўмоў інтэграцыі Польшчы з Еўрасаюзам. У спатканні прысутнічалі міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, намеснік ваяводы Ежы Паўяновіч і спецыялісты па справах еўрапейскай інтэграцыі.

— Гэта ад нас залежыць ці ў час рэферэндуму выкажамся за ўваходам у Еўрасаюз, ці супраць, — ад гэтых слоў стараста Уладзімір Пятрочук распачаў спатканне. Паінфармаваў ён як Гайнаўшчына карыстаецца еўрапейскімі фондамі. Самаўрады Гайнаўшчыны хадайнічаюць аб сродках на будову прадпрыемства утылізацыі адкідаў, адкрыццё чыгуначнага транспарту з Гайнаўкі ў Белавежу, разбудову турыстычнага асяродка побач вадасховіча Рэпчычы і рамонт вуліц у Гайнаўцы і Белавежы. Владзімеж Цімашэвіч заахвочваў галасаваць за ўступленне Польшчы ў Еўрасаюз. Расказаў пра Грэцыю, Іспанію і Ірландыю, дзе павысіўся ўзровень жыцця грамадства пасля далучэння да Еўрасаюза. Віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч прыгадаў, што на працягу апошніх 10 гадоў ваяводства атрымала 326 мільёнаў злотых з еўрапейскіх фондаў на будовы дарог, ачышчальні сцёкаў і іншыя самаўрадавыя інвестыцыі.

Удзельнікі дыскусіі перш за ўсё гаварылі пра фінансаванне сельскай гаспадаркі. Уладзімір Паскробка сумняваўся ці Падляшскае ваяводства атрымае сродкі набліжаныя да іншых ваяводстваў. Спецыялісты былі згодны з яго апасаннем. Віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч абяцаў намагацца, каб Падляшскае ваяводства атрымала больш сродкаў на рэструктурызацыю. Зараз у вялікай ступені залежаць яны ад ліку насельніцтва, якога ў Падляшскім ваяводстве намнога менш, чым у іншых рэгіёнах. Прысутныя пыталіся пра магчымасці развіцця чыгуначнага таварнага перахода побач Семяноўкі, што магло б спрычыніцца да абмежавання беспрацоўя ў гэтым рэгіёне.

Паколькі на сустрэчы прысутны быў кіраўнік польскай дыпламатыі, не абышлося без пытанняў пра вялікую палітыку.

— Пасля вайны прадбачваецца адбудова Ірака і Польшча дзякуючы падтрымцы Злучаным Штатам разлічвае на ўдзел у гэтых інвестыцыях. Гэта можа выклікаць канфлікт паміж Польшчай і іншымі краінамі Еўрасаюза, — гаварыў павятовы радны Міхась Андрасюк.

Владзімеж Цімашэвіч заявіў, што падтрымка для ваенных дзеянняў у Іраку ўзмацняе значэнне Польшчы ў Еўрасаюзе.

У ходзе спаткання спецыялісты гаварылі аб даплатах да сельскагаспадарчай прадукцыі, патрэбе аховы ўсходняй мяжы і заахвочвалі хадайнічаць аб перадакцэсійных сродках. У Гайнаўскім павеце прадбачваецца стварэнне калектыву, які будзе памагаць гмінам рыхтаваць адпаведныя дзеля гэтага дакументы.

Аляксей Мароз

Сто гадоў у пошуках сяброў

Дакладна невядома калі ўзнікла Беларуская сацыялістычная грамада — пры канцы 1902 ці на пачатку 1903 года, але напэўна мінула ўжо звыш ста гадоў ад часу, калі заіснавала структура сучаснага беларускага палітычнага руху. Стагоддзе мінула ў пошуках шляхоў так нацыянальнага, як і дзяржаўнага вызначэння. Беларусы ў гэтых пошуках паставілі сабе асаблівыя мэты. Усе суседнія народы вызначалі тэрыторыю, якая паводле іх меркаванняў з'яўлялася іх этнічнай зямлёй і пераконвалі ўсіх навокал, усялякімі даступнымі сродкамі і метадамі, што такая воля неба. Часам такое пераконванне працягвалася дзесяткі гадоў, часам суседнія народы мелі лепшыя аргументы ў выглядзе мацнейшых армій, але заўсёды раней ці пазней прыходзіў спрыяльны час тым, хто яго чакаў. Народы станавіліся гаспадарамі зямлі, на якой пражывалі. Нават малыя супольнасці ў Прыбалтыцы пабудавалі свае дзяржавы, якія цяпер карыстаюцца вялікім прэстыжам у Еўропе.

Беларусы ад самага пачатку шукалі сабе сяброў, з якімі хацелі б будаваць супольную дзяржаву. Найчасцей былі гэта палякі і расіяне, але падчас I сусветнай вайны разважаўся таксама праект літоўска-беларуска-латышскай дзяржавы. Каталікі найчасцей змагаліся за адбудову Рэчы Паспалітай ці Вялікага княства Літоўскага, праваслаўныя — за дэмакратычную Расію, у якой магло б быць месца для беларускай аўтаноміі. Беларускія дзеячы чамусьці верылі, што ў прыродзе можа выступаць сяброўства ці салідарнасць паміж народамі. Тым часам у Беларусь прыходзілі арміі „сяброў", краіну трактавалі як калонію, а яе жыхароў — як зняволеных. У 1921 г. „сябры" падзялілі краіну так як ім было выгадна. Беларусы пасля вялікіх расчараванняў як польскай, так і савецка-расійскай палітыкай у міжваенны перыяд, кінуліся шукаць новых саюзнікаў. Адзіным рэальным была тады гітлераўская Германія. Але немцы, наадварот чым беларусы, усіх іншых лічылі ворагамі. Калі нават і нешта давалі, дамагаліся ў замен вялікіх ахвяраў.

Пасля вайны здавалася, што ўсё прапала. Беларускія эліты былі вынішчаны ўсімі акупантамі, некаторыя прабывалі на эміграцыі, тыя, якія не ўцяклі на Захад, былі вывезены на Усход. Якія-небудзь разважанні пра беларускую дзяржаву пасля 1945 г., у адарванні ад савецкага кантэксту, маглі бачыцца толькі ў катэгорыях шаленства. Ніхто не мог прадбачыць так маланкавага развалу савецка-расійскай імперыі.

У 1990 г. народы, якія знаходзіліся ў падобнай сітуацыі што беларусы, карыстаючыся палітычнай нагодай, рашуча ўзяліся будаваць свае дзяржавы. Іх логіка была слушнай. Спачатку свой дом, свой хлеб, а пасля можна было шукаць сяброў для суседскіх гутарак. Беларусы, якія таксама фармальна атрымалі свой дом на ўласнасць, пачалі разважаць ці не папрасіць суседа, якому плацілі арэнду за сваю ўласнасць, каб захацеў далей карыстацца такой прывілеяй. Прэзідэнтам выбралі найбольшага энтузіяста здачы краіны пад чужое ўладанне, а ў чарговых рэферэндумах выказаліся за ажыццяўленне яго ідэй.

Старонняму назіральніку сітуацыя выглядае прыблізна так, быццам жыхары камунальнай савецкай кватэры заявілі аб патрэбе вяртання супольнага туалета, прыбіральні, кухні і калідора, якія раней дзялілі з суседзямі. Так ім добра жылося ў гэтай камуналцы з суседзямі, што захацелі вярнуцца ў мінулую эпоху. Як не глядзі, выглядае гэта на ўцёкі ад інтымнасці і самастойнасці, якой шукаюць усе еўрапейскія народы, а ў прыватным жыцці — звычайныя людзі.

У нас на Беласточчыне ўсё выглядае амаль таксама. Кожная спроба стварэння якой-небудзь сістэмы, дазваляючай пабольшыць поле вырашэння беларусамі сваіх праблем, заўсёды канчаецца масавай дэманстрацыяй нашым людам падтрымкі для чужых партый, канцэпцый ці ўстаноў, што прапануюць адваротны працэс. „Нашы" эліты ўжо даўно заўважылі, што кожная дзейнасць накіраваная на абмежаванне беларускасці, вядзе да ўзнагарод і павышэнняў. Таму яшчэ праз некалькі гадоў, час ад часу будзе можна прачытаць у лакальнай прэсе, што „wysokim urzędnikiem (posłem) został przedstawiciel środowisk prawosławnych (białoruskich)". А праз нейкі час мясцовыя палітыкі і інтэлектуалы будуць гаварыць: „Był tu na Białostocczyźnie taki ruski ludek..., ale jak się on dokładnie nazywał..."

Яўген Міранові́ч

Вачыма паляка

Беларушчына — фірмавы знак

Тры паветы паўднёвай Польшчы — Наватаргскі, Татраўскі і Сончаўскі на год да ўступлення ў Еўрасаюз засцераглі ў Патэнтавай палаце назоў і спосаб вырабу сыру асцыпка. Такім чынам нідзе больш у нашай краіне нельга будзе яго вырабляць дзеля гандлю, прынамсі тэарэтычна і згодна з прынцыпамі прыстойнага рынку. Адначасова Патэнтавая палата не пагадзілася засцерагчы асцыпак выключна для займаючагася яго вырабам бурмістра аднае з прытатранскіх гмін. Хацеў ён манапалізаваць арыгінальны сырок, каб прыбытак ад яго мела выключна ягоная фірма. Так, вось, зможа ён вырабляць асцыпак і карыстацца яго назовам, але на раўні з іншымі горцамі.

Пры гэтай нагодзе стаў я задумвацца, што мы маем у нас, на Беласточчыне, такога, што можна было б засцерагчы як уласнае, арыгінальнае, а што будзе магло канкурыраваць з патрабавальным і насычаным еўрасаюзным рынкам. З лозунгаў, што і раз выказваных урадавымі і самаўрадавымі чыноўнікамі Падляшскага ваяводства чуецца, і не першы раз, у першую чаргу ў пералічванні рэгіянальных козыраў, што наша багацце гэта **шматкультурнасць**. Для прыкладу, можна тут прывесці адну з шматразова выказваных думак падляшскага маршалка Януша Кшыжэўскага: „Вандруючы па Падляшшы, можам акунацца ў іншасці, чэрпаць з яго унікальнасці, узбагачацца яго непаўторнай моцай". Харошы сказ, каларытны. Толькі што вельмі ж абстрактны (не наясіся шматкультурнасцю).

Прыбытку ад „акунання ў іншасць" ніхто не мае, асабліва тутэйшыя жыхары. Думаю, што прыйшла пара, а, можа, нават і апошняя хвіліна, каб сапраўды выпрацаваць канкрэтны сцэнарый, які акрэсліў бы, які мае быць наш рэгіён, што запрапануе ён іншым краінам, грамадзянам Еўрасаюза, чым ён мае прываблівацъ. Прытым цяжка сабе ўявіць, каб ахоплівай ён усё ваяводства. Урэшце ж, больш-менш падзяляючы, гэта Беласточчына, адменная ў традыцыях, геаграфічным і нацыянальным характары, Сувальшчына і яшчэ іншая Ломжынская зямля. Пабудова дарог, ачышчальняў і іншай г.зв. інфраструктуры гэта падстава, аб якой у кантэксце заахвочвання да рэгіёна нават гаварыць не варта. Гледзячы на Беласточчыну, тавар амаль такі як горскі асцыпак, гэта тутэйшыя беларусы: беларуская культура, традыцыя, спосаб кантачання і жыцця, асабліва на вёсцы. Усё тое, аднак, што з беларушчынай звязана, патрабуе асаблівай апекі з боку ўрадавых і самаўрадавых улад, і гэта не нейкай галаслоўнай, а, у першую чаргу, фінансавай. На пачатак, для прыкладу, варта памагчы ў стварэнні Цэнтра беларускай культуры ў Беластоку.

Тым часам пачытаў я брашуру выдадзеную Бюро па справах еўрапейскага рэферэндуму Рады Міністраў. Аўтары сцвярджаюць у ім: „Падляшша гэта рэгіён найбольш дыферэнцыяваны этнічна і нацыянальна — пражывае тут каля 350 тысяч беларусаў, 12 тысяч літоўцаў, 5 тысяч татараў, а таксама украінцы і рускія". І столькі на гэту тэму ў выданні азагалоўленым „Województwo podlaskie na drodze do Unii Europejskiej". Рэшта датычыць грошай перададзеных ужо, або тых, што маюць наплысці з ЕС на інфраструктуру. Ні слова аб тым, чаго апроч „цывілізавання" нашых дарог, малых і сярэдніх фірмаў і г.д. чакаем ад Еўрасаюза, што ёсць нашым „фірмавым знакам", што для грамадзян будучай дваццаціпяцёркі будзе непаўторным атракцыёнам.

Нічога больш не застаецца, як намовіць блізкага мне беларуса Вандала Арлянскага: хай у Патэнтавай палаце засцеражэ беларушчыну. Еўрасаюзная будучыня пакажа, што гэта добры гешэфт.

Мацей Халадоўскі

Славенцы ў Корашцы

Славенцаў, якія ў палове I тысячагоддзя н.э. паявіліся ва Усходніх Альпах, суседнія германцы назвалі *Windisch* — ад кельцкага слова *vindos* — белыя. Ад іх наймення, мабыць, былі названы і мясцовасці Вена і Венецыя, між якімі пасяліліся славенцы. Іх дзяржава Карантанія існавала з 7 да 11 стст., і яе ядро знаходзілася ў басейне верхняй Дравы і Мура — у сённяшняй Карынтыі (Корашцы). У 1335 годзе ўсе славенскія землі трапілі пад уладанне Габсбургаў.

Першым дакументам, у якім сустракаецца славенская мова, былі „Фрэйзінгенскія ўрыўкі" з 9-10 ст. У 16 ст. на славенскай мове выйшлі пратэстанцкія Катэхізіс і Біблія; пазнейшая контррэфармацыя забараніла ўжываць гэтую мову. У манастырах і гарадах царыла нямецкая мова, яна пранікала і на вёскі. Навучанне дзяцей адбывалася на нямецкай мове і найвыдатнейшыя людзі падвяргаліся германізацыі, запыняючы такім чынам узнікненне ўласнай інтэлігенцыі.

Пад Габсбургамі толькі з паловы 19 ст. было дазволена навучанне на славенскай мове, але рашэнне аб гэтым прымалі нямецкія мясцовыя чыноўнікі і яна рэдка трапляла ў публічныя школы; найчасцей яна навучалася ў парафіяльных школах. Паколькі славенскай мовай карысталіся галоўным чынам сяляне, а славенскімі асветнікамі былі ксяндзы, усё славенскае называлі клерыкальна-адсталым, а германскае — прагрэсіўным. Паводле германскіх перапісаў колькасць славенцаў у Корашцы сістэматычна падала: у 1846 годзе было іх каля 120 тысяч, у 1880 — 102 тысячы, у 1910 — 82 тысячы.

Пасля распаду імперыі Габсбургаў мірная канферэнцыя ў Сен-Жэрмен рашыла правесці плебісцыт у частцы Корашкі, якая знаходзілася на поўдзень ад лініі Цэлявец (Клагенфурт) — Белак (Вілах). На плебісцытным абшары пражывала 69% славенскамоўнага насельніцтва. 10 кастрычніка 1920 года за прыналежнасцю да Аўстрыі выказалася 22 025 чалавек (59%), а за Югаславію — 15 279 (41%); звыш 10 тысяч корскіх славенцаў прагаласавала за Аўстрыю. І ўжо 25 лістапада 1920 года адзін з тамашніх германскіх лідэраў Артур Леміш заявіў: „Аднаўляючы Радзіму мы не можам забыць ніводнага чалавека, які выказаўся за далучэнне да Югаславіі. За адно пакаленне сам народ Карынтыі павінен вярнуць тых спакуснікаў у нямецкую культуру і карынцкую ўтульнасць — зрабіць гэта павінны дом, школа і Касцёл!" Стваралісся перашкоды славенскай культуры і асвеце. Тры гады пасля ў трэці славенскамоўных сем'яў карыстанне роднай мовай знізілася на 60%, а ў 1938 годзе карысталася ёю ўжо толькі 26% насельніцтва Паўднёвай Корашкі. Варта прыгадаць, што яшчэ пры Габсбургах усе палітычныя сілы Аўстрыі намагаліся шчыльней падпарадкаваць славенскія землі дзеля геапалітычнага выхаду германцаў на Міжземнае мора.

Аншлюс Аўстрыі ў сакавіку 1938 года антыславенскую палітыку вывеў у афіцыйны ранг. „Зрабіць мне ўсю краіну нямецкай!" — запатрабаваў Гітлер. Лідэры славенцаў апынуліся ў канцлагерах; на іх судовых папках у полі „віна" было слова „славенец". Славенскія ўстановы былі закрыты, а за публічнае ўжыванне славенскай мовы пагражаў штраф. 10 лютага 1942 года ўсе славенскія імёны і прозвішчы былі германізаваны. 14 красавіка 1942 года, зараз пасля скарэння Югаславіі, пачалося масавае выгнанне славенцаў з Корашкі. Было вывезена каля 50 тысяч чалавек, галоўным чынам у Паўднёвую Германію, а іх месца займалі немцы. Супраць гэтага зверства запратэставаў корскі біскуп Рограхер, але яму Гімлер рэкамендаваў займацца справамі нябеснымі.

Шматлікія корскія славенцы сталі на шлях узброенага супраціўлення нацысцкаму насіллю. Ужо ў 1942 годзе паўстаў першы корскі партызанскі атрад Вызваленчага фронту, які ў палове 1944 года налічваў каля сямісот байцоў. У баях загінула 1 080 корскіх славенцаў, 710 было раненых, 317 палонных. Дзеяннямі Вызваленчага фронту кіравалі Цітавы паліткамісары і за корскім насельніцтвам паявілася ў Карынтыі асацыяцыя: партызаны — камунізм — змаганне за Югаславію — пагроза граніцам — пагроза Радзіме.

Пасля вайны дыпламаты Югаславіі зноў сталі хадайнічаць за далучэнне да яе Паўднёвай Корашкі, але безвынікова. Корашка апынулася ў брытанскай акупацыйнай зоне Аўстрыі. Выселеныя славенцы вярталіся не без вялікіх клопатаў на радзіму. Новыя мясцовыя ўлады абяцалі корскім славенцам выпраўленне крыўдаў учыненых нацыстамі, адраджэнне славенскага школьніцтва, культурнага і гаспадарчага жыцця ды ўвядзенне славенскай мовы ў мясцовыя ўстановы.

У кастрычніку 1945 года ўсе пачатковыя школы ў Паўднёвай Корашцы былі абязаны навучаць усіх вучняў дзвюм мовам: першыя тры гады ў аднолькавым аб'ёме, пасля рэдукуючы славеншчыну ў карысць нямецкай мовы. Калі пасля 1955 года Аўстрыю пакінулі акупацыйныя войскі, германскія арганізацыі пачалі гэтаму супраціўляцца, пагражаючы школьнымі забастоўкамі. У выніку ў 1959 годзе ў Карынтыі было адменена абавязковае навучанне славенскай мовы, зводзячы яе да прадмета, навучаемага са згоды бацькоў. У 2000/2001 навучальным годзе на дзвюхмоўнай тэрыторыі Корашкі дзейнічала 79 школ з 5 989 вучнямі, з ліку якіх у 63 школах 1 657 вучняў наведвала двухмоўныя ўрокі, а ў дзвюх школах у Цэляўцы — 113 вучняў; у 12 школах навучанне славенскай мове абавязковае. У 1957 годзе ў Цэляўцы была заснавана Дзяржаўная славенская гімназія, у якой зараз вучыцца 453 вучні; школа (www.bgslo.at) уступіла ў кантакт з меншаснымі школамі м.інш. у Вялікабрытаніі і Германіі. З 1990 года дзейнічае ў Цэляўцы двухмоўнае Гандлёвае вучылішча, якое сёння наведвае 128 вучняў. Настаўнікаў для гэтых школ рыхтуюць універсітэты ў Цэляўцы, Грацы і Вене. На Універсітэце ў Цэляўцы працуе Славянскі інстытут, які ў славенскай дзялянцы займаецца этнаграфічнымі даследаваннямі.

Горы Караванкі ў Паўднёвай Корашцы

У 1977 годзе была заснавана Музычная школа, якая сёння ў 20 аддзелах навучае 577 вучняў. Твораць мастакі і літаратары, працуюць галерэі і выдавецтвы. Каля пяцідзесяці культурна-асветных арганізацый згуртаваных у Славенскім асветным звязе і Хрысціянскім культурным звязе. Дзейнічаюць гаспадарчыя кааператыўныя арганізацыі. 22 каманды з 2,5 тысячамі спартсменаў аб'яднаны ў Славенскім спартыўным звязе; гоншчык Петар Вроліх у Атланце і Сіднеі ды ў сёлетняй Велагонцы міру змагаўся за аўстрыйскую каманду.

У Цэляўцы дзейнічаюць Славенскі навуковы інстытут і Славенскі этнаграфічны інстытут, якія даследуюць побыт і дзейнасць корскіх славенцаў. Там жа працуе Славенская бібліятэка з сямідзесяцітысячным кнігазборам. Выходзяць славенскія часопісы „Наш тыднёвік", „Славенскі веснік", „Сям'я і дом", „Малады род", „Цэляўскі звон", а найбольш чытачоў мае каталіцкая „Нядзеля". Славенскія багаслужбы адпраўляюцца ў сямідзесяці касцёлах.

Паводле перапісу насельніцтва з 1991 года, у Корашцы пражывае каля 15 тысяч славенцаў, але славенскія арганізацыі ацэньваюць гэты лік на 35-40 тысяч. У парламенцкіх выбарах на кандыдатаў корскіх славенцаў выпадае каля 6 тысяч галасоў і гэтага замала для выбару свайго дэпутата; адзіны дагэтуль славенец быў выбраны са спіска Зялёных. Пры федэральным канцлеры існуе Рада нацыянальнасцей з прадстаўнікамі ад вядучых арганізацый.

Аўстрыйскае тэлебачанне вяшчае раз у тыдзень паўгадзінную перадачу на славенскай мове „Добры дзень, Корашка", якую аглядае 85% славенскамоўных гледачоў; цэляўскі радыёцэнтр штодзень вяшчае 50-хвілінную перадачу. Дзвюм прыватным корскім радыёстанцыям з канцом мінулага года была спынена фінансавая падтрымка і іх працаўнікі ў сакавіку аб'явілі галадоўку. Корскія заступнікі хадайнічалі ў еўрасаюзных і федэральных установах і ў Вене атрымалі абяцанне кругласутачнага вяшчання на славенскай мове...

Аўстрыйскае заканадаўства прадбачвае справаводства для меншасцей і двухмоўныя тапаграфічныя назвы для меншасных мясцовасцей. У 1972 г. былі пастаўлены нямецка-славенскія шыльды ў 205 паўднёвакорскіх мясцовасцях. Ноччу з 20 на 21 верасня таго ж года ўсе яны былі знішчаны... Сёння ўстанаўленню такіх шыльдаў супраціўляюцца ўлады Карынтыі на чале са скандальна вядомым тамашнім галаваром Ёргам Гайдэрам, які прапануе паставіць такія шыльды, але ў... Славеніі. Некаторыя лідэры славенцаў сцвярджаюць, што дзеянні ўлад абмяжоўваюцца да палітыкі сімвалаў, за якімі няма канкрэтных крокаў. Ды і германскія ветэранскія арганізацыі пільна цікуюць гетызаванасці сваіх сужыльцаў...

Корскі пісьменнік і драматург Янка Меснер напісаў: „У нашым жыцці ў Карынтыі, дзе забіраюць грунт з-пад ног, няма паэзіі, няма яе і ў нашых сэрцах, адно жоўць пагарды, якую ўсмоктваем з мацярынскім малаком. Няма паэзіі ў нашых словах, толькі громкія цемра, лямант, кленчанне — без крошкі надзеі, без узнёсласці..."

Аляксандр Вярбіцкі

Касцёл св. Яна ў Рожу каля Бароўля (Ферлах)

10 конкурснае пытанне

У колькіх школах у Карынтыі навучанне славянскай мове абавязковае?

Адказ: .....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 1 чэрвеня 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***7-е конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Юліта Давідзюк** з Новага Корніна, **Кшыштаф Прычыніч** з Махнатага і **Анна Раманюк** са Старога Беразова.

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Заўсёды разам з мамай. „Роднае слова 2003", Нараўка

Найдаражэйшая мамачка!

Маленькія савяняты любілі, калі мама-сава расказвала ім казкі. Аднойчы раніцай, калі захацелася ім ужо спаць, дзеці спыталі:

— Мамка, раскажаш нам сёння новую казку?

— Маё казачнае меню канчаецца, аднак учора ноччу я прыгадала старую гісторыю, якую даўным-даўно расказвала мне мая мама. Хочаце паслухаць?

— Ясна! — савяняты падтакнулі і адно з іх заахала:

— Мамка, расказвай!

— Тады слухайце. Даўно-даўно таму...

— Не!.. — запратэставала найменшае птушаня, — так пачынаецца кожная казка, а мы хочам нешта арыгінальнае.

— Дык слухайце далей, — прывяла іх у парадак сава, — добрая казка заўсёды мае стары пачатак.

У лясной краіне-дзяржаве жылі адны звяры. Найбольш было птушак, а найменш — мышэй. Мышыную сям'ю складалі ўсяго чатыры асобы — бацькі і двое дзетак: Імак і Донка. Яны жылі ў сваёй норцы на ўскраіне лесу. Па-суседску пасялілася сям'я вялікіх пацукоў. Пацукі прыкідваліся мірнымі суседзямі, аднак, у глыбі душы, жадалі з'есці мышэй. Аднаго разу пацукі так прагаладаліся, што задумалі з'есці суседзяў. Яны прыдумалі хітры план.

— Добры дзень, любыя дзеткі! — прывітаўся стары пацук з мышанятамі. — Ці не жадаеце мілыя пагуляць у Фауна-ландзе?

— Вядома, жадаем! — уцешыліся Імак і Донка.

— А ці маеце залатыя манеты? Уступ у Краіну гульні каштуе пяць залатых манет.

— Вось бяда! — засумаваў Імак, — у няс няма грошай. Мамка не дазваляе нам хадзіць у Фауна-ланд.

— Ваша мамка такая скупая, — скрывіўся стары пацук, — яна зусім пра вас не дбае!

Мышаняты любілі сваіх бацькоў, аднак цяпер ім зрабілася крыўдна.

— А нашы дзеці кожны чацвер гуляюць у Фауна-ландзе, — не адступаў пацук.

— Мы ўцячэм з дома! — расплакалася Донка.

— Ну, супакойцеся, мілыя, — цягнуў стары хітрун — вы лепш прадайце сваіх бацькоў.

Мышаняты ахвотна згадзіліся. За тое, што сказалі дзе начуе іх маці, пацук даў пяць залатых манет.

Раніцай пачаліся праблемы. Мышаняты ўсталі з пасцелі і... пачалі плакаць, бо не было каму падрыхтаваць сняданак, прыбраць ложкі, дапамагчы ў рашэнні школьных задач.

Донка і Імак зразумелі як вялікае глупства ўчынілі. Яны на хаду кінуліся ў дом пацукоў. На ганку, у клетцы, сядзела іхняя мама. Лянівыя пацукі яшчэ спалі. Мышаняты адкрылі дзверцы клеткі і разам з мамай уцяклі дадому. Неўзабаве мышыная сям'я перасялілася ў другі канец лесу.

Імак і Донка зразумелі на ўсё жыццё, што мама даражэй усяго на свеце.

— Але ж файная казачка! — сказала адно савянятка.

— Мы ніколі не зрабілі б гэтак як мышаняты, — гукнула другое.

(нак-с)

Мая мамачка

Мая мама плача.
Я не знаю чаму.
Сядзіць сама каля акна
Сумная і задуманая чагосьці.
— Ці штосьці сталася? —
Пытаю я маму,
А яна толькі прытулілася
І плача.
Гарачыя слёзы сплываюць па яе шчоках.
Не знаю, чаму яна плача.
Шкадую я сваю мамачку,
А яна мяне.
Не знаю далей,
Што такое здарылася ў яе жыцці?
Думаю, што моцна забалела ў яе сэрца.
Ці плача ад шчасця, ці з жалю?
Я сама ўжо не знаю.

СЯБРОЎКА

Авяр'ян ДЗЕРУЖЫНСКІ

Што спяваюць мамы-птушкі

Вечарком вясновым
Качка
Качанятак
Ложыць спаць,
Качаняткам,
Пыляняткам,
Стала песню
Напяваць:
— Кра-кра-кра,
Кра-кра-кра,
Ноч прыходзіць,
Спаць пара.
І заснулі,
Спяць пад песню
Качаняткі
Ночкай весняй.

Вось варона
Варанятак,
Малых дзетак,
Ложыць спаць,
Вараняткам,
Дзіцяняткам,
Стала песню
Напяваць:
— Кар-р, кра, р-ра,
Кар-р, кра, р-ра,
Ноч настала,
Спаць пара.

І заснулі,
Спяць пад песню
Вараняткі
Ночкай весняй.

А сава
Дык савяняткам
Не дае
Спакойна спаць:
— Ух-ух-ух —
Хутчэй вы з хаткі
Вылятайце
Паляваць,
Ух-ух-ух,
Ух-ух-ух!..

Крылы ўверх —
І — шух-шух-шух —
Паляцелі
Савяняткі
Ў цемру ночы
Ўслед за маткай.

Польска-беларуская крыжаванка № 21

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 17: Мядок, народ, горад, ляда, сведак, кант, сваяк. Яслі, вянок, дар, лек, мора, яда, код, Данія, факт.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Юліта Давідзюк**, **Марцін Александрук** і **Давід Янцэвіч** з Новага Корніна, **Лукаш Гайдук** і **Януш Мінко** з Нарвы.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Вялікая сінагога

На Гаўрыіла ва Уладаве

Разам з вясной ва Уладаву хлынулі турысты. Мястэчка знаходзіцца ў трыста кіламетрах ад Беластока, на мяжы трох дзяржаў — Польшчы, Беларусі, Украіны. Тут асаблівыя помнікі мінулага.

Горад акольвае рэчка Уладавянка, а некалькі метраў далей на ўсход плыве магутны Буг. З боку Буга мястэчка бачыцца як старажытная крэпасць. Пабудаванае яно на высокім беразе ракі і ў многім напамінае Драгічын. Адсюль бачым як залацяцца ў сонцы медзяныя купалы старой царквы і касцёл. Храмы стаяць у самых відных і прыгожых месцах. Разам з барочным касцёлам, кляштар айцоў паўлінаў.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Радыёжурналістка Аліцыя Петручук і айцец Мікалай Хадакоўскі

У глыбі мястэчка, куды ідзем крутымі вузкімі вуліцамі са старой яўрэйскай забудовай, дзве сінагогі. У мінулым Уладава лічылася важным жыдоўскім цэнтрам. У добра захаваных будынках вялікай і малой сінагогі працуюць музеі. Іх можна наведаць за невялікую плату. У сярэдзіне вялікай сінагогі самая прыгожая ў Польшчы, блакітна-зялёна-залатая алтарная шафа.

Падымаемся лесвіцай у бабінец і нас чакаюць тут чарговыя атракцыёны — падляшскі этнаграфічны музей і незвычайная выстаўка старых ікон. Іконы знайшлі ў багажы кантрабандыстаў польскія пагранічнікі і таму выстаўка завецца: „Z walizki przemytnika".

На парафіі

Наведваем праваслаўную парафію.

— Хрыстос Уваскрос! — вітаемся з айцом Мікалаем Хадакоўскім.

Бацюшка распазнаў нас з парога.

— Заходзьце, калі ласка, у дом. „Зорку" ведаюць ва Уладаве, восенню 2001 года нашы сябры з Бельска-Падляшскага, разам з мясцовымі дзяцьмі, размалёўвалі тут каляровы крыж.

— А можа вы галодныя? — угашчае нас айцец Мікалай, сам ён родам з Гайнаўкі.

Бацюшка адзначае:

— Крыж падабаецца не толькі мясцовым, яго фатаграфуюць турысты, цікавяцца наведвальнікі. Цудоўны экуменічны падарунак гораду. Дзеці па сёння ўспамінаюць супольнае маляванне.

Разам ідзем у царкву XVIII ст. У сярэдзіне адхланне ад спякоты — сёння на двары да трыццаці градусаў цяпла. Захапляемся старымі іконамі. У царкве відавочныя сляды царкоўнай традыцыі з часоў Вялікага княства Літоўскага. Услед за намі сышлася сюды процьма турыстаў. Ля царквы чуем англійскую, польскую, яўрэйскую мовы. Нам прыемна тут гутарыць з бацюшкам па-падляшску.

Талерантнае мястэчка

— Наша парафія невялічкая, — распавядае бацюшка, — усяго сорак сем'яў.

Урокі праваслаўнай рэлігіі адбываюцца ў плябаніі.

— На заняткі прыходзіць 10 вучняў пачатковай школы, 4 гімназісты і 15 навучэнцаў сярэдніх школ, — пералічвае айцец. Ён асабіста ведае ўсіх сваіх прыхаджан. Мясцовыя дзеці ўдзельнічалі ў размалёўванні крыжа.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Царква ва Уладаве

Мястэчка Уладава невялікае, тут пражывае пятнаццаць тысяч жыхароў. Яно надалей захоўвае сваё шматкультурнае аблічча.

— Мы не сустрэліся тут з праявамі варожасці, — адзначае святар.

Пытаем пра жыццё праваслаўных. Большасць з іх лічыць сябе „тутэйшымі". Старыя людзі гавораць на падляшскім дыялекце. У царкве зрэдку бываюць хрэсьбіны, апошні шлюб адбыўся ў 1995 годзе!

Ля іконкі Мучаніка Дзіцяткі Гаўрыіла

На памятку сустрэчы робім ля крыжа фотаздымкі. Уражвае нас цудоўная акалічнасць — большасць іконак на зялёна-залатым крыжы прадстаўляе святога Мучаніка Дзіцятку Гаўрыіла, ахоўніка дзяцей і моладзі. Наша вандроўка якраз і выпала ў свята Гаўрыіла Заблудаўскага.

Ганна Кандрацюк



Вясна

Паводле календара, вясна пачынаецца 21 сакавіка. У гэты дзень дзеці топяць у рацэ Маранну. Гэты абрад сімвалізуе адыход зімы і пачатак панавання вясны.

Я ведаю, што ў нашых продкаў — у паганскія часы — новы год пачынаўся вясной. Багіняй вясны і жыцця была Жыва. Адным з найбольшых веснавых святаў было гуканне вясны. Людзі святкавалі гуканне вясны спальваючы ляльку — Маранну, якая ўвасабляла зіму. Яны таксама палілі старыя рэчы сабраныя зімой. Каля гэтага вогнішча людзі сыходзіліся і спявалі веснавыя песні.

Вясна з'яўляецца вельмі прыгожай парой года. Якая ж гэта цудоўная з'ява, калі прырода абуджаецца з зімовага сну. Сонца пачынае мацней свяціць. Дні становяцца даўжэйшымі і цёплымі. Дрэвы выпускаюць маладыя зялёныя лісточкі. З-пад зямлі нясмела вырастаюць першыя веснавыя кветкі. Самыя першыя цвітуць сінія пралескі і белыя кураслепы.

Ранняй вясной птушкі вяртаюцца з выраю. Мяркуецца, што калі прыляцяць буслы — гэта значыць, што ўжо запануе вясна. Я таксама чула іншыя павер'і звязаныя з птушкамі. Калі хтосьці вясною першы раз пачуе кукаванне зязюлі і мае пры сабе манету — у гэтым годзе ён будзе багаты і шчаслівы. Таму заўсёды вясною я нашу з сабою манету.

Вясна — мая любімая пара года. Я люблю, калі на панадворку цёпла (а не горача, як летам) і зялёна. У такое цёплае, сонечнае надвор'е мне не хочацца вучыць урокі, ні сядзець у хаце. Хочацца толькі хадзіць на прагулкі і дыхаць чыстым паветрам. Я думаю, што кожнаму чалавеку (нават калі ён стомлены, сумны ці нешчаслівы) вясной хочацца жыць.

Анна Паўлючук,
I „б" кл. белліцэя ў Гайнаўцы

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Мастак (першы злева) і ўдзельнікі вандроўкі

Цуд у Бобры (2)

Карціна „Пад расійскім ботам": на паліцы тусуюцца красамоўныя рэквізіты — Біблія Францішка Скарыны, Статут Вялікага княства Літоўскага, Слоўнік беларускай мовы, вышыванка, лапці і васілёк. Над усім павіслі казацкія чобаты-афіцэркі.

Нацыянальная тэматыка ўсё актуальная ў Беларусі і выклікае жарсці. Парадаксальна, свае „нацыяналістычныя" карціны Алесь Пушкін мог паказаць нядаўна ў Расіі. Апошняя персанальная выстаўка „А. Пушкін і яго Беларусь", прысвечаная 85 гадавіне Беларускай Народнай Рэспублікі, адбылася ў Маскве. Выстаўка працавала з 26 сакавіка па 20 красвіка г.г., у выставачнай зале „Варшавка".

* * *

Пушкін умее іграць са спадзяваннямі публікі.

Быў позні вечар, калі гаспадар вярнуўся з дарогі, ён увайшоў у хату і пабачыўшы кампанію за сталом, тэатральна здзівіўся. Праз колькі хвілін Алесь Пушкін з цікаўнасцю кожнага з нас аглянуў, перадумаў, пасля загадаў:

— Сёння вы ўжо нікуды не паедзеце!

Як добры акцёр, пацэліў у нашу найбольшую прагу, карацей, мы самі чакалі зручнага моманту, каб упрасіцца нанач.

Затым мастак пакорпаўся ў сваім рукзаку і паставіў на стол буталь напою маркі „Бобр". Трохлітровы буталь з аўтарскай пячаткай мае таксама ярлык „культавага" і пра яго апавядаюць легенды ў Мінску. Мы ахнулі ад захаплення, бо „напой" аказаўся першачком бобраўскага разліву.

* * *

Пушкін жыве сціпла, але з фантазіяй. Дом-галерэя з трох частак — кухні, майстэрні і спальні. Вялікую частку хаты займае хлебная печ. На варце, ля ўвахода ў кухню-салон, стаіць разьба — пудзіла Мураўёва з аголеным чэлесам. Замест галавы ў генерала-губернатара драпежны птах.

У покуці, за круглым сталом — змена настрою: архангел Міхал, ахоўнік Беларусі. Разьба мае ўжо сваю легенду.

— Пад ёй чамусьці заўсёды садзяцца найбольшыя нонкамфармісты, — мастак пералічвае гасцей-зорак: Кася Камоцкая, Слава Адамовіч, Анатоль Сыс. З гэтай нагоды і я на міг стала гераіняй вечара.

У Пушкіна ўсё культавае, нават прыбіральня. Драўляны туалет, які знаходзіцца на панадворку і ўяўляе сабой дзірку ў зямлі, прамаўляе як сімвал прыгнёту і таталітарызму. Каб пакарыстацца такой штукай, трэба прысесці на кукішкі. Над нашымі паводзінамі, згары, будуць сачыць класікі камунізму — Ленін і Энгельс.

* * *

За сталом мастак апавядае пра свой хепенінг пад загалоўкам „Soldier of Fortune" („Жаўнер удачы"). Акцыя адбылася 3 ліпеня 2002 года ў Мінску, паміж рэстаранам „Папараць кветка" і Чырвоным касцёлам. На здымках улоўлены момант дракі з міліцыяй.

Алесь Пушкін узяў быў з сабою нямецкую аўчарку па клічцы Ганс, апрануўся ў форму, якую насілі жаўнеры беларускіх нацыянальных фарміраванняў у гады вайны, дзіцячыя лялькі, 3,7 м белай тканіны, а таксама белую і чорную фарбы.

Дзея пачалася пад музыку з альбома „Mutter" нямецкага гурту „Rammstein". Пушкін намаляваў васьміканцовую зорку, потым з'явіўся Ганс і пачаў нешта вынюхваць. Нарэшце сабака знайшоў партрэты беларускіх генералаў Усевалада Родзькі і Міхася Вітушкі.

Далей перформер узяў лялькі і разам з аўчаркай пайшоў купаць іх у басейне, а памыўшы, роўненька расклаў іх перад партрэтамі. На прасцірадле збіраўся зрабіць надпіс „Слава героям!". У акцыю, мабыць, згодна з планам, увайшла міліцыя.

* * *

Пушкін ведае, як уцягнуць у дзеянне публіку.

Калі міліцыянт спакойна і дзелавіта загадаў мастаку прыбраць свае цацкі, той нацкаваў на праваахоўнікаў Ганса. Перформеру выбілі з рук партрэты ды перакулілі фарбу, якая расцяклася па чаравіках міліцыянтаў. Пушкіна ўрэшце закавалі ў кайданы і кінулі ў варанок.

— Перад тым я яшчэ паспеў узняць партрэты генералаў і крыкнуць „Людзі, памятайце аб подзвігу Усевалада Родзькі і Міхася Вітушкі! Слава героям!"

Суд адбыўся ўжо на другі дзень і чарговы ўжо раз апраўдаў і вызваліў перформера.

— Я маю шчасце, мяне судзяць інтэлігентныя і прыгожыя жанчыны, — зводзіць усё ў жарт Алесь. Не дазваляе гутарыць пра праследы. Прынцыпова не наракае.

Многія з нас здзівіліся дзелавітасцю і лагічнасцю легендарнага скандаліста.

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Карціна „Пад расійскім ботам"

Пушкін ходзіць па доме ў тапачках, не ўжывае алкаголю, не смаліць цыгарэт (і цыгара). У гэты вечар ён прасіў прабачэння за адсутнасць у супольнай гасціне. Раніцай з галавой кінуўся маляваць Маці Вострабрамскую.

* * *

Пушкін — рамантык.

— Найбольш натхняе мяне паэзія, — прызнаецца. У яго калекцыі процьма паэтаў і літаратурных сюжэтаў. Наш Юрась атрымаў у падарунку свой аўтапартрэт з пачатку дзевяностых. На гарышчы ў Бобры захоўваецца вялікая рамантычная карціна з Мірай Лукшай у блаславлёным стане. Сярод паэтаў бачым і Славаміра Адамовіча, дарэчы, тыдзень пазней з'ехаў ён у эміграцыю.

Але ўсё гэта, як кажа Пушкін, „ерунда" ў параўнанні з цудам, што чакаў нас у мясцовай царкве...

(працяг будзе)

Ганна Кандрацюк

Мяшчанскія пісанкі

10 мая ў Музеі малой айчыны ў Студзіводах каля Бельска была адкрыта чацвёртая выстаўка „Мяшчанскія пісанкі". Прымеркаваная яна да 750-гадовага юбілею пісанай гісторыі горада Бельска-Падляшскага, навокал якога распаложаны былі мяшчанскія вёскі.

Відава, Парцава і Спічкі ад усходу і Ягуштова, Стрыкі, Шасталы ад захаду — гэта вёскі, якія мяшчанскі статус захавалі да 1915 года. Характэрнымі ім былі багатыя абрады і звычаі. Адным з іх элементаў з'яўляюцца пісанкі (піскі) — сімвал жыцця, кахання і ўраджаю. На Падляшшы прымяняюцца дзве тэхнікі ўпрыгожвання яек: пісанне стугаўкаю і булаўкаю. На самым пачатку на шкарлупіне трэба нарысаваць узор, які, так як і колер, мае сваё значэнне.

Чырвоны колер абазначае Хрыстовую кроў, пралітую за чалавечыя грахі, зялёны, жоўты і карычневы — радасць ад Уваскрэсення Хрыстовага, а фіялетавы і блакітны — пакуту, смутак і пост. Узоры на пісанках невыпадковыя. Напрыклад, матыў Сонца на чубках яйка абазначае ўсход і захад. Павучкі, млынкі, ёлачкі, званочкі, вінаград — сімвалы кахання, ураджаю, спакою, дастатку і пакоры перад сілай Гасподняй.

Яйкі пачыналі ўжо пісаць ад Вербніцы, у Вялікую суботу свянцілі, раздавалі дзецям як валачобнае, а на Провады, у першую нядзелю або панядзелак пасля Вялікадня неслі на могілкі, а пасля абеду перакідвалі цераз хату і закопвалі ў месцы, дзе яно ўпала (паводле традыцыі, якая яшчэ жывая ў Ягуштове, мела гэта ахоўваць хату ад пажару).

Выстаўка складаецца з дзвюх частак. У першай у трох памяшканнях — каморы, кухні і вялікай хаце — паказаны пісанкі Валянціны Белаказовіч з Відава, Вольгі Анацік, Веры Малішэўскай, Надзеі Магуцэвіч, Марыі Манаховіч з Ягуштова, Раісы Зінкевіч з Шасталоў, Ніны Якімюк са Стрыкоў. Да гэтага прыкладзены славутыя ягуштоўскія мазуркі Вольгі Асташэвіч. Другая частка змяшчае прыклады ўзораў на пісанках.

Спатканне ў музеі рознілася ад папярэдніх. Апякун і галоўны арганізатар выстаўкі Дарафей Фіёнік зноў прыемна ўразіў наведвальнікаў. Апрача пісанак зрабіў госцям музычны падарунак. Пад адкрытым небам каля пяцідзесяці асоб слухалі „Крыўчанак" з Крыўца, „Арэшкаў" з Арэшкава і дзіцячай групы „Антракт". А да гэтага чыталіся вершы Марыі Манаховіч і Вольгі Анацік пра Вялікі пост, штодзённае жыццё на вёсцы і пра родны край — Беласточчыну.

Паўліна Шафран

Будова ў крэдыт

У 1998 годзе Бельскае староства пачало будову спартыўнай залы пры Комплексе школ н-р 2 у Бельску-Падляшскім. Інвестыцыя пачыналася з невялікім удзелам казённых сродкаў. Пазыковыя абавязацельствы Бельскага павета, мэтай якіх было завяршэнне пабудовы спартыўнай залы ў 2003 годзе, з'яўляюцца галоўнай прычынай запланаванага на гэты год бюджэтнага дэфіцыту велічынёю амаль 2 615 тыс. злотаў.

У 2002 годзе недахоп фінансавых сродкаў на згаданую задачу дасціг 2 318 тыс. зл. У той час паявілася магчымасць атрымання сродкаў з Управы фізкультуры і спорту велічынёю ў паўмільёна злотаў, але пры ўмове выдаткавання ўласных сродкаў (1 818 тыс. зл.) на рэшту задачы ды завяршэнне яе на працягу двух гадоў, г.зн. у 2003 годзе. Тэрмін заканчэння інвестыцыі аказаўся закароткі, а недахоп фінансавых сродкаў завялікі. Агулам у мінулым годзе на будову было прызначана 500 тыс. зл., з чаго са сродкаў павета толькі 170 тысяч.

У гэтым годзе будова залы паглыне ўсяго 1 318 тыс. зл., з чаго 170 тысяч складзе датацыя з Міністэрства нацыянальнай адукацыі і спорту, а рэшта будзе з крэдыту, узятага для гэтай мэты ў бягучым годзе.

Міхал Мінцэвіч

У добрай атмасферы

Да пісьмовых экзаменаў на атэстат сталасці, якія з 8 па 10 мая прайшлі ў Агульнаадукацыйным ліцэі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыступілі 148 вучняў. З экзамену па беларускай мове звольнены былі 15 лаўрэатаў і фіналістаў алімпіяды беларускай мовы. Вучні, якія пісалі працы па беларускай мове, выбіралі адну з трох прапанаваных тэм:

1. „Самая вялікая каштоўнасць на свеце — чалавек" (Васіль Вітка). Дакажы слушнасць гэтых слоў, умацоўваючы сваё выказванне прыкладамі з вядомых табе твораў беларускай літаратуры.

2. Цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй, без адчування сваіх вытокаў, без памяці, без роду і племені. Прайдзіся сцежкамі памяці беларускага народа, прыгадай яго спадчыну.

3. Выкажы свае думкі і рэфлексіі, якія наводзіць на цябе верш Пімена Панчанкі „Схема жыцця".

— У час экзамену па беларускай мове была добрая атмасфера. Мы былі больш спакойнымі, чым на іншых экзаменах, — сказала Аліцыя Леанюк. — Я рашылася пісаць пра чалавека як вялікую каштоўнасць. У сваёй рабоце спасылалася я, у галоўным, на творы Брыля і Багушэвіча. Прадставіла таксама ўласныя рэфлексіі.

Тэмы пісьмовых прац па беларускай мове гайнаўскім ліцэістам спадабаліся. Найбольш вучняў рашылася пісаць на першую тэму. Аднак мала менш асоб выбрала другую і трэцюю тэмы. Бацькі хваляваліся больш за вучняў. Супакоіліся, калі іх дзеці аддалі працы па беларускай мове.

— Я рашылася пісаць на першую тэму, бо яна тычыцца жыццёвых праблем і закранае чалавечыя вартасці, — заявіла Кацярына Кандрацюк.

Адклікаючыся да беларускай літаратуры вучні найчасцей пісалі аб праблемах прадстаўленых у паэме Якуба Коласа „Новая зямля", яго трылогіі „На ростанях", спасылаліся на герояў твораў Васіля Быкава, Янкі Брыля і звярталі ўвагу на Кастуся Каліноўскага.

— Тэмы прац не былі лёгкімі і патрабавалі ад вучняў глыбейшых рэфлексій. Ліцэістам трэба было падабраць адпаведную літаратуру, а пішучы на другую тэму — ведаць гісторыю Беларусі. У гэтым годзе многа вучняў рашылася пісаць працы на падставе верша, бо быў ён лёгкім для аналізу, — сказаў настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі. — У агульным вучні напісалі добрыя працы. У найлепшых работах адклікаліся да замежных літаратур і Бібліі. Паяўляліся цікавыя філасофскія разважанні.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Перад экзаменам

* * *

Ліцэісты спадзяваліся, што па польскай мове могуць быць тэмы пра вайну, чалавека або сэнс жыцця. Вучняў I „а" класа абрадавала першая тэма, у якой закраналася праблема чалавечага шчасця. На падобную тэму пісалі раней работу ў школе. Па біялогіі (здавалі 18 асоб) і гісторыі (23 асобы) задачы і тэмы паказаліся для ліцэістаў цяжкімі. Моцна хваляваліся вучні, якія рашалі задачы па матэматыцы (60 асоб), бо атрымаліся розныя вынікі. Белліцэісты рады былі пытанням па рускай мове (27 асоб). Найменш вучняў прыступілі да экзаменаў па англійскай (5 асоб) і нямецкай (4 асобы) мовах. 11 асоб упершыню здавалі пісьмовыя экзамены па геаграфіі.

— У час пісьмовых экзаменаў вучні вялі сябе як дарослыя і не трэба было іх супакойваць. Ліцэісты працавалі салідна і выкарыстоўвалі амаль увесь час прадбачаны для экзаменаў, — паінфармаваў дырэктар белліцэя Яўген Сачко.

Вусныя матуральныя экзамены пачаліся з беларускай мовы. Многія ліцэісты звольнены з іх, бо атрымалі вельмі добрыя і выдатныя ацэнкі па пісьмовых працах, а і раней добра вучыліся па гэтым прадмеце.

Аляксей Мароз

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Андрэй Каліноўскі прапануе кнігі аматарам перш за ўсё сучаснай літаратуры

Іншыя кнігі ў „Акцэнце"

У кнігарні „Акцэнт" на Рынку Касцюшкі, 15, у Беластоку, можна набыць, апрача польскіх, кнігі на беларускай мове, выдадзеныя ў Беластоку, м.інш. Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва", з серыі Бібліятэчкі „Белавежы". Кнігарня „Акцэнт" распаложана ў вельмі зручным месцы, на заходняй сцяне Рынку Касцюшкі, за сквером ззаду ратушы, і наведвальнікі часта проста заходзяць паглядзець навіны, пагартаць кнігі, пацікавіцца, неабавязкова купіць новую кнігу.

— Недзе ад года людзі пытаюцца пра іншамоўныя кнігі, пра рускую літаратуру, — кажа Андрэй Каліноўскі, саўладальнік кнігарні. — Была ў Беластоку кнігарня па вул. Кілінскага, дзе можна было набыць кнігі выдадзеныя ў Савецкім Саюзе, найбольш па-руску і па-беларуску. Цяпер там можна трапіць толькі на нейкія альбомныя выданні. Жывем у такім прыгожым месцы, на стыку розных культур, у пэўным сэнсе „на крэсах". Абавязак культурнага чалавека — даць кожнаму тое, што яго цікавіць. І мы рашылі пашырыць наш кнігазбор на іншыя кнігі.

„Акцэнт" наладзіў кантакт з фірмай „Książka Rosyjska" ў Варшаве ў справе пастаўкі ў Беласток кніг з новых каталогаў. Кнігі — з розных бібліяграфічных груп, м.інш. белетрыстыкі, паэзіі, прозы, філасофіі, гісторыі, медыцыны, літаратуры для дзяцей і моладзі, сучаснай літаратуры і класікі вялікіх майстроў, а таксама слоўнікі, лексіконы, энцыклапедыі, альбомы, музычныя выданні, ноты, кампакт-дыскі (класічная, царкоўная і эстрадная музыка).

— Падпісалі мы з імі дамову, — працягвае А. Каліноўскі. — На паліцах маем цяпер каля 200 загалоўкаў кніг, класікі і сучаснасці. Мы зрабілі гэта перш за ўсё дзеля аматараў класікі і гурманаў сучаснай рускай літаратуры, якія хочуць чытаць яе ў арыгінале. Маем, напрыклад, усе кнігі Уладзіміра Высоцкага. Спелім ціхую надзею, што і гэта прыцягне чытачоў. Прымерваемся ў найбліжэйшы час памяняць свой выставачны франтон, зробім надпіс, які 24 гадзіны кожны можа ўбачыць, што такія кнігі можна ў нас набыць.

Пакуль што, прадаецца больш-менш па 20 кніг на рускай мове. Да гэтай пары кнігалюбы набылі больш за 100 кніжак з „рускай" паліцы.

— Гэта толькі сігнал і ўступ. Тыя кліенты, з якімі мы размаўлялі аб кнігах, распытвалі пра іншыя. Большасць кніг, якія яны патрабуюць, можам знайсці — калі няма іх у Беластоку, замовім у Варшаве, на працягу 10 дзён, кожныя два месяцы хтосьці едзе па кнігі ад нас, а для найбольш цярплівых дастанем кнігі з самае Расіі. Усе кнігі маем у каталогу — гэта дзве тысячы загалоўкаў. Гэта добра, бо ж у нас месца няшмат. Цэны на гэтыя кнігі ў нас такія, як у найтаннейшай кнігарні ў Варшаве, а нават таннейшыя, бо ў нас ніжэйшая нацэнка. Веру, што ўсё гэта ў нас раскрунецца, бо, усё ж, сусветная літаратура на рускай стаіць...

Чатыры разы ў год паяўляецца новы каталог з новымі кнігамі. У апошнім, сапраўды, ёсць з чаго выбіраць. Ад сусветнавядомых класікаў, казак ды медыцыны — па „Сакрэты рускай кухні" ды „Секс і савецкі шпіянаж"... (куша)

Царкоўныя брацтвы

9 мая г.г. ва Універсітэце ў Беластоку адбылася, ладжаная Аддзелам гісторыі культур памежжа тамашняга Інстытута сацыялогіі і Праваслаўным брацтвам св. св. Кірылы і Мяфодзія, навуковая канферэнцыя прысвечаная царкоўным брацтвам у Рэчы Паспалітай. З дакладамі і паведамленнямі выступалі Антон Мірановіч, Тэрэса Хынчэўска-Генель, Мікалай Мікалаеў, Пётр Хомік, Яраслаў Матвяюк, Уршуля Паўлючук і Ежы Урвановіч. Прысутнічалі таксама прарэктар УвБ Ніна Семянюк, дэкан Факультэта гісторыі і сацыялогіі УвБ Ганна Параф'яновіч і загадчык Інстута сацыялогіі УвБ Андрэй Садоўскі.

Царкоўныя брацтвы, якія ад сярэдзіны 15 ст. сталі завязвацца сярод цэхавай гарадской знаці, былі своеасаблівым водгукам праваслаўных эліт Рэчы Паспалітай на новыя духовыя плыні з Заходняй Еўропы: Рэнесанс і рэфармацыю. Ды і іх пуцяводным свяцілам сталі культура і асвета, дапамога патрабуючым. Брацтвы былі элітарнымі арганізацыямі, нешматлікімі, напр. Львоўскае брацтва налічвала не больш пяцідзесяці членаў. З цэха рамеснікаў вылучалася брацтва, якое мела свой храм. Брацтвы клапаціліся пра павышэнне адукацыі праваслаўнага духавенства, арганізавалі школы, шпіталі, прытулкі, пазыкавыя фонды. Яны не ўзнікалі ў адзінаканфесійных гарадах і былі з'явай характэрнай толькі для ўсходняй часткі Рэчы Паспалітай. У той час адбываліся масавыя канверсіі праваслаўных вяльможаў у прыцягальныя заходнія канфесіі: пратэстантызм і каталіцызм. Брацтвы, выступаючы ў абарону праваслаўя, стараліся ствараць таму прыцяжэнню супрацьвагу — наглядалі яны за царкоўнай культурай і асветай, за тварэннем міласэрнасці і дапамогай людзям. З другой паловы 16 ст. брацтвы ставілі сабе галоўнай мэтай рэфармаванне Царквы, увод у карыстанне наважытных моў уключна з латынню. Але брацтвы, якія апекаваліся цэрквамі, карысталіся таксама некаторымі прывілеямі, што выклікала незадавальненне іерархаў і іх адступніцтва ад праваслаўя; Брэсцкая вунія была вынікам не толькі палітычнага ціску, але і вынікам тагачасных грамадскіх працэсаў.

У завяршэнне канферэнцыі былі паказаны новыя кнігі, прымеркаваныя да тэмы канферэнцыі. Першая з іх, „Bractwa cerkiewne w Rzeczypospolitej" Антона Мірановіча, прысвечана духоваму жыццю праваслаўных вярхоў у 15-18 стст. Другая, „Kult ikon Matki Bożej w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI-XVIII wieku" Пятра Хоміка, датычыць духовага жыцця праваслаўных нізоў...

Аляксандр Вярбіцкі

Апошняя дарога

Матыў дарогі і вандроўніка знайшоў сваё адлюстраванне ў творчасці ўсіх членаў Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа". Вандраванне з'яўляецца неад'емнай часткай людской прыроды. Пакуль чалавек вандруе як пілігрым, ён вымушаны перамагаць пакуты гэтага свету аж да канца сваёй дарогі. Чым больш аддаляемся ад свайго мінулага, тым больш узрастае ахвота вяртання да месца нараджэння. І часта гэтае вяртанне становіцца апошняй дарогай...

Дарог у жыцці Янкі Жамойціна было надзвычай многа. У міжваенны перыяд вандраваў ён у Варшаву, каб там вучыцца ў праваслаўнай мітрапольнай семінарыі і адначасова ў польскай гімназіі. У 1939-1941 гадах вучыўся ён у савецкай дзесяцігодцы ў Лідзе. Падчас нямецкай акупацыі кіраўніцтвам Беларускай незалежніцкай партыі быў накіраваны на працу ў Саюз беларускай моладзі дзеля пашырэння ідэі незалежнасці сярод маладога пакалення. Знаходзячыся ў пасляваеннай Польшчы быў ён у 1949 годзе арыштаваны савецкімі органамі Міністэрства дзяржаўнай бяспекі, вывезены ў Мінск і там засуджаны на 25 гадоў зняволення. З Валадарскай мінскай турмы перасыльнымі этапамі ў Петрапаўлаўску і Акмолінску быў перавезены ў гулаг Спаск, што на ўскраіне Караганды.

Пасля Хрушчоўскай адлігі на працягу 1956 года ў лагер прыехала камісія Вярхоўнага Савета СССР для перагляду спраў зняволеных зэкаў. Адносна Янкі Жамойціна камісія прыняла рашэнне „освободить со снятием судимости и поражения прав". Пасля сямігадовага зняволення і розных перыпетый

1 студзеня 1957 года Янка Жамойцін пераехаў у Варшаву, дзе жыла яго сястра Людміла. У яе застаў свайго сына Леслава і даведаўся, што жонка Янкі загінула ў дарожнай катастрофе. Неўзабаве Янка ажаніўся з надзвычай сімпатычнай Галінай, якая памагла яму выхаваць сына Леслава. Янка закончыў Варшаўскі універсітэт і атрымаў дыплом магістра адміністрацыі.

Паводле слоў жонкі Галіны, Янка Жамойцін зусім не ашчаджаўся ў жыцці. Пасля пераходу на пенсію ён астаўся працаваць у скураным кааператыве „Corium" на паўстаўкі. Шмат працаваў на сваёй дачы пад Варшавай. Быў членам Літаб'яднання „Белавежа" і БГКТ. Многа гадоў выконваў абавязкі старасты ў царкве на Волі. І пісаў, безупынна пісаў...

Напісаў ён біяграфічную аповесць „З перажытага", апублікаваную Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва" ў кніжцы „Лёс аднаго пакалення" (Беласток 1996). Скарочаная версія аповесці з'явілася ў кніжцы „Беларускія пісьменнікі Польшчы" (Мінск 2000). Апублікаваў ён таксама шмат літаратурна-крытычных прац, прысвечаных дасягненням „Белавежы". У „Беларускім календары на 2002 год" апублікаваў абшырнае эсэ „Беларускае літаратурнае аб'яднанне «Белавежа» — учора і сёння". У апошні час Янка Жамойцін шмат працаваў над гісторыяй Саюза беларускай моладзі падчас нямецкай акупацыі і, на жаль, не паспеў яе дакончыць.

Нягледзячы на стан здароўя — у мінулым годзе меў складаны пералом нагі і даўжэйшы час ляжаў у шпіталі — адважыўся на сваёй машыне паехаць з жонкаю на каталіцкія Велікодныя святы да сына Леслава, які мае пансіянат у Быстшыцы-Татшанскай (400 км ад Варшавы). Там Янка захварэў грыпам. Вярнуўшыся ў Варшаву пасля аднадзённага адпачынку адправіўся на сваёй машыне з братавай унучкай і яе аднагадовым дзіцём у Ліду да сястры і брата на праваслаўны Вялікдзень. Стоячы ў чарзе на польска-беларускай мяжы 25 красавіка схапіў раптам Янку шырокі інфаркт і ўміраючага не ўдалося ўжо рэанімаваць.

Раніцай 29 красавіка, трэцяга дня праваслаўнага Вялікадня, адбылося пахаванне нябожчыка. Паніхіду ў царкве на варшаўскай Волі служыла восем святароў і двух дыяканаў. Развітацца з памерлым прыйшло многа людзей. Над магілай на мясцовых праваслаўных могілках з прачулымі прамовамі выступілі настаяцель царквы св. Іаана Лесвічніка на Волі а. Анатоль Шыдлоўскі і старшыня Рамесніцкай палаты, якой падлягаў кааператыў, у якім працаваў Янка Жамойцін. Намагільная пліта шчыльна пакрылася вянкамі і букетамі кветак, прынесенымі роднымі, сябрамі і добрымі знаёмымі нябожчыка.

Няхай Табе, Дарагі Янка, выгнанніку са сваёй Айчыны, гасцінная польская зямелька будзе пухам! Няхай Цябе, шматпакутнага, Усявышні Бог мае ў сваёй апецы!

Віктар Швед

Віктар Швед

Памяці Янкі Жамойціна

Ты, Дружа, ехаў на Радзіму,
Якою заўжды даражыў,
Даехаць стала немагчымым —
Смерць вартавала на мяжы.

Ехаў сустрэцца з сястрой, братам
Пасля жыццёвых перашкод,
Каб з Велікодным веснім Святам
Вітаць свой край і свой народ.

Цябе Ўсявышні Бог паклікаў
Так нечакана да Сябе,
А мы тут, у смяротных ліку,
Надта сумуем па Табе.

У развітальныя хвіліны
Не паўстрымалі сваіх слёз
Твае сябры, Твая Радзіна,
Калі пяюць „Хрыстос уваскрос".

Няхай Табе спакойна спіцца
Па ўсіх ганеннях вечным сном,
Хай вольная Айчына сніцца,
Якой быў верным Змагаром.

У жыцці па-рознаму прыходзілася (2)

З Аляксеем ВОЛЧУКАМ пазнаёміўся я ў Гайнаўскім шпіталі. Дзевяностагадовы старэча аказаўся незвычайным кампаньёнам у палаце. Гаваркі, дапытлівы і... набожны. Штодзень зранку і ўвечары маліўся. „У царкву трэба хадзіць і Божае слова слухаць. Каму Царква не маці, таму Бог не бацька", — казаў.

(заканчэнне; пачатак у 20 н-ры)

Служыў я ў Владаве ў 9 палку цяжкай артылерыі. Салдацкую долю раздзяляў з Толікам Уштвандам з вёскі Відамля, у гміне Турна, што пад Каменцам знаходзіцца. З першага дня знаёмства прысягалі вернасць. Толік быў адзіным сынам у бацькоў. Не спадзяваўся ўспамогі ад старэчаў, бо ў беднасці жылі. Бацька ягоны пры царскім парадку жандарам служыў. Пры саветах, як прызорны лічыўся. Я яму брата заступаў. У адной шапцы хадзілі. Харчамі ўспамагаў.

Полк лічыў восем батарэй, па сорак коней у кожнай. На адзін гарматні разлік чатыры кані выпадала. Я кіраваў першай парай як „чоловы". Затым былі: „пшэдорчы, орчы і дышлёвы". На гэтых апошніх рослых і моцных салдатаў выбіралі. Як праходзіў рэкруцкае абучэнне, дык выдатнікам стаў. Наш гарматні разлік першым на парадах выступаў. За ўзорныя паводзіны да прысягі пяць дзён водпуску атрымаў, а ў канцы паўтарагадовай службы — званне „бамбардзіра" і пахвальны ліст.

Шыкарных коней мелі ў часці. Моцныя і вялікія каштаны, з буйнай грывай і белай плямкай на ілбе. Куплялі двухгадовых. Пад сядло прызначалі пасля двухгадовага абучэння, а да гарматняй запрэжкі — у пяць гадоў.

Камандзірам часці быў палкоўнік Мульнер. Акуратна да салдат ставіўся. Свабода была ў нашай батарэі. Праваслаўныя рускія песні спявалі, з батарэйнага прыёмніка перадачы на рускай мове слухалі, але палякі найчасцей выключалі радыёпрыёмнік. На богаслужэнне хадзілі. Праваслаўныя ў царкву, а каталікі ў касцёл. З казармаў выходзілі ў кампактным страю чацвёркамі. Суправаджаў афіцэр. Праваслаўныя падафіцэры не трымалі строгага рэжыму і пасля прыходу пад царкву давалі волю салдатам, прыгадваючы пры тым, у які час павінны яны ставіцца на збор, каб вярнуцца ў казармы. У каталіцкіх падафіцэраў такога не практыкавалася. З касцёла не дазвалялі выходзіць. На Шлёнску ў вайсковых часцях праваслаўных праследавалі.

На Каляды збіраліся ў святліцы. Давалі селядцы і па „чвэртцы" гарэлкі на чатырох салдат. Першымі спявалі польскія пастаралкі, затым праваслаўныя калядкі. Хлопцы з-пад Слоніма ці Кобрына бадзёра спявалі. Зямля дрыжала ад спеву, сцены казармаў варушыліся.

Аўтамабілямі не карысталіся, бо іх не было ў часці. Афіцэраў падвозілі на станцыю, ці адтуль забіралі ад поезда двухколавымі павозкамі. Мне найчасцей даручалі гэтую справу. Пры кожнай паездцы я атрымоўваў „чайное". Ад Вялікадня па Каляды зэканоміў 25 злотых. Пасля ўвальнення з арміі выязджаў з прыбыткам 40 злотых. Купіў за гэтыя грошы туфлі і сукенку жонцы. Вельмі абрадавалася падарункам. Харчаванне слабенькае давалі. На снеданне лусту хлеба і кубак збожжавай кавы з цыкорыі. На абед суп і кусочак мяса з тоўчанай бульбай. На вячэру зноў хлеб і кава. Мала было яды салдатам. Многім пасылкі пасылалі бацькі. Я прыкупліваў прадукты з зэканомленага „чайнога" ды ўспамагаў Толіка Уштванда. Калі памёр маршалак Пілсудскі, дык выдалі нам па вялікім куску каўбасы.

У час вайсковай службы на ваенныя вучэнні з Владавы ў Брэст ездзілі. Месяц праводзілі на прадмесці Валынкі, якая ад Владавы ў 60 км. знаходзілася. Затым вярталіся.

З пачаткам вайны ў 1939 годзе, я атрымаў павестку з'явіцца ў сваю часць у Владаву. Салдатам выдавалі уніформы па вёсках, паколькі казармы знаходзіліся пад безупынным наглядам нямецкіх самалётаў. Пасля сфармавання эшалона, коней пагрузілі ў крытыя вагоны, а гарматы на платформы. Накіравалі нас на Брэст, а пасля праз Высокае і Чаромху ў Седльцы. Безупынна ехалі вайсковыя транспарты. Не даязджаючы да Мрозаў мы папалі пад абстрэл нямецкіх самалётаў. Машыніст спыніў поезд. Мы кінуліся з вагонаў хто куды. Снарад трапіў у першы вагон. Пасля рамантавалі пуць і падаліся на Варшаву. Пад Грохавам арганізавалі батарэю. На гармату прызначылі дзесяць фураў снарадаў (па 30 штук на кожным фургоне). Адтуль пайшлі на сталіцу. Затрымаліся ў звярынцы. Уначы з гарматаў стралялі па горадзе. Удзень царыла цішыня. Рабілі гэтак, каб не праявіць сваіх пазіцый. Не было акуратна сфарміраванага атрада.

Салдаты знаходзіліся ў батарэі з розных падраздзяленняў. Запамятаў словы сустрэтага палкоўніка, які кінуў у мой бок: „Żołnierzu, Polska rozbita. Szukajcie ratunku". З Варшавы падаліся на Калушын. Адтуль на Гарволін. Горад быў разбураны. Немцы дайшлі адно да рускай граніцы і назад вярталіся. З-пад Гарволіна салдаты з разбіных часцей уцякалі ў напрамку Варшавы. Немцы разбівалі сустрэтае польскае войска. Не даходзячы да горада пераапрануўшыся ў цывільнае адзенне, рушылі мы ў напрамку Седльцаў. У вёсцы Грабянуў мясцовыя людзі растлумачылі, як дайсці ў Сямятычы. На Бугу, перад Сямятычамі, мост застаўся неразбураны. У горадзе я адчуваў сябе як дома. Да Седльцаў дабіраліся ўчацверых. У Сямятычы — двух, у кампаніі калегі з-пад Браньска (прозвішча не запомнілася). Начаваў у Сычах. Адтуль дабраўся ў Грузку. Немцаў там не было. Як ішлі на Варшаву, дык нікога з мясцовых не чапалі. У Мілейчычах немцы арганізавалі камісарыят, а затым і маёнтак. Жыхары навакольных вёсак хадзілі там на працу. Ахову маёнтку складалі жандары. У Мілейчычах засталося дзесяць васточнікаў, якія задумалі раззброіць ахову і прывітаць рускіх. У гронку парабкаў знайшоўся сышчык, які паведаміў пра гэта немцам. Солтыс Міхноўскі паспеў паведаміць аб здрадзе двух васточнікаў, тэхнікаў будовы. Яны з жонкамі ўцяклі ў лес, адно дзеці засталіся. Немцы іх не чапалі. Загадалі солтысу, каб імі апекаваўся. Апошніх восем васточнікаў арыштавалі і вывезлі ў невядомым кірунку. Двух васточнікаў-уцекачоў вярнуліся пасля ў Мілейчычы і забраўшы дзетак выехалі ў Расію. Апошні ваенны час пражыў я ў Грузкай спакойна. На працу хадзіў у Мілейчычы.

Запісаў Уладзімір Сідарук

Новая (старая) кааліцыя

Падляшская народная ініцыятыва (PIL) — так называецца ад Дня перамогі новы, у пяць асоб, клуб радных „Самаабароны" ў Падляшскім сейміку. Мусіў ён перамяніць назву, паколькі не сарваў кааліцыі з СЛД-УП-ПСЛ, як гэтага хацеў ад радных „Самаабароны" ва ўсёй краіне Анджэй Лепэр.

Аб новай назве клубу і нанава прынятых галоўных тэзісах кааліцыйнай праграмы інфармавалі прадстаўнікі падляшскай кааліцыі на спецыяльна скліканай прэс-канферэнцыі.

— Маем за сабой чарговую фазу, якая мае фармаваць палітычную сцэну ў нашым ваяводстве, — гаварыў падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі. Член управы Караль Тыленда, шэф новага клуба PIL, пераконваў наконт рашэння аб тым што засталіся яны ў кааліцыі:

— Мы — палітыкі, а не палітычныя авантуршчыкі. Будзем хацець утрымаць кааліцыю да канца кадэнцыі.

Другі з членаў управы, які прадстаўляе былую „Самаабарону", цяпер сябра PIL Ян Камінскі, дадаў:

— Закладваем, што не павінна быць дыскусіі над кшталтам кааліцыі, а трэба канцэнтравацца над рэалізацыяй кааліцыйнай праграмы.

Ад імя ПСЛ віцэ-старшыня ўправы Кшыштаф Талвінскі падкрэсліў:

— PIL — трывалы і актыўны элемент нашай кааліцыі.

Старшыня Сейміка, а адначасова шэф клуба СЛД Збігнеў Кшывіцкі заявіў:

— Працягласць кааліцыі — доказ адказнасці, асабліва за драматычную сітуацыю ў некаторых галінах.

Як падкрэслілі Караль Тыленда і Ян Камінскі, нявыключана, што ў будучыні „новы палітычны быт", асабліва перад парламенцкімі выбарамі, можа заснаваць кааліцыю. Магчыма, што з ПСЛ, але і не выключана, што і з Кансерватыўна-народнай партыяй Артура Баляша, якога сябрам, як прызнаўся, ёсць Караль Тыленда.

У апошніх самаўрадавых выбарах на Падляшшы „Самаабарону" падтрымала каля 20 тысяч асоб.

— Выбаршчыкі падтрымліваюць наша рашэнне застацца ў кааліцыі. Будзем верныя нашаму асяроддзю і праграме, на якую аддалі свае галасы, — падкрэсліў Ян Камінскі.

Журналістам у адзінаццаці пунктах былі прастаўлены галоўныя праграмныя тэзісы новай-старой кааліцыі. Зводзяцца яны да збітых фраз, напр.: „Паправа фінансавага становішча самаўраду ваяводства"; „зменшанне дыстанцыі паміж сярэднімі падляшскімі і краёвымі стандартамі" ці „выкарыстанне новых шанцаў для рэгіёна", „дзеянні якія папулярызуюць і падтрымліваюць культуру нашага ваяводства, яе складанасць і непаўторнасць, пошукі новых фінансавых рашэнняў у культурнай дзейнасці".

— Гэта галоўныя праграмныя прадпасылкі пасля нашага вопыту, вызначанага перш за ўсё сёлетнім, цяжкім бюджэтам, ведай, што рабіць, каб драматычнае становішча ў некаторых галінах паправіць, — супольна падкрэслілі маршалак Кшыжэўскі і старшыня Кшывіцкі. (холм)

Найдаражэйшае здароўе

Кожнаму чалавеку найдаражэйшае здароўе. Чалавек вытрымае ўсялякае гора, але калі пачне хварэць дык тады найгоршая бяда, бо і да лекара-спецыяліста цяжка дастацца, і ў бальніцу, у якую захочаш, цябе не прымуць.

Нядаўна вырашана ліквідаваць рэгіянальныя касы хворых, а ў іх месца стварыць Нацыянальны фонд аховы здароўя. Што з гэтага вынікне? Мабыць, пацыенту не абазначае гэта вялікіх змен. А вось вызваленым працаўнікам рэгіянальных кас хворых трэба будзе выплаціць належныя кампенсацыі ў сувязі з ліквідацыяй месц працы. На гэта прыйдзецца выдаць з дзіравага дзяржаўнага бюджэту мільёны злотых, а потым у месца вызваленых набраць новых працаўнікоў, яшчэ большую чымсьці дагэтуль армію бюракратаў.

Наракалі хворыя на ахову здароўя і надалей будуць наракаць. А вось прыклад з Нарваўскай гміны. У вёсках распаложаных у заходняй частцы гміны такіх як Бялкі, Трасцянка, Сацы і Пухлы большасць жыхароў складаюць пенсіянеры, якія перапісаліся з Гміннага асяродка аховы здароўя ў Нарве ў Раённую амбулаторыю ў Заблудаве толькі з-за таго, што калі прыйдзецца ім палажыцца ў бальніцу, дык з Заблудава атрымаюць накіраванне ў Беласток, а з Нарвы накіроўваюць у Гайнаўку.

У Гайнаўцы, трэба тут сказаць праўду, прыгожая новая бальніца, добрыя лекары і ветлівы персанал, але найважнейшае, што ў гайнаўскай бальніцы пацыент можа пагутарыць з лекарамі і медсёстрамі на роднай гаворцы. А гэта многа значыць, асабліва старэйшаму чалавеку, якому цяжка даводзіцца размаўляць на польскай мове. Найгорш, што сямейнікам цяжка даехаць у Гайнаўку праведаць сваіх хворых, а ў Беластоку могуць наведваць іх кожны дзень.

Найгоршая бяда і ў тым, што калі хтосьці захварэе і патэлефануе на нумар 999, то прыедзе скорая з Гайнаўкі і ўжо ў Беласток цябе не адвязуць. Тады вымушаны ты ляжаць у гайнаўскай бальніцы. І яшчэ — праз вёскі Трасцянку і Бялкі едзе хуткая дапамога з Беластока ў вёску Гозьну, што ў Міхалоўскай гміне, але ты яе не зможаш выклікаць. Гавораць, што хворы можа выбраць сабе бальніцу, але ад нас у Беласток хуткая дапамога не завязе. Варта, каб аб гэтым падумалі рэфарматары службы аховы здароўя.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Я грамадзянін ці няпрошаны госць?

Ісці, ці не ісці мне галасаваць у рэферэндуме за далучэнне Польшчы да Еўрапейскага Саюза? Не ведаю, як мне захавацца, калі да мяне ў гэтай справе ніхто не звяртаецца. Перадрэферэндны шум, які раздаецца з усіх сродкаў масавай інфармацыі, звяртаецца толькі да палякаў, а не да польскіх грамадзян. А я ведаю, што ў Польшчы жывуць не толькі палякі, але жыву і я, беларус. Усе правы і абавязкі маю роўныя з палякамі, як грамадзянін Польшчы. Калі ніхто не звяртаецца да польскіх грамадзян, а толькі да палякаў, то я не маю чаго шукаць.

Васіль ПЕТРУЧУК

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Ранняй вясной разводзяцца дзікі

Веснавыя колеры і праблемы

Сёлетняй вясной, як штогод, на лугах і аблагах расцвітае полымя. Няспешна лунаючыя дымы над затуманенымі краявідамі прыманьваюць здалёк сваёй прывабнасцю. Аднак выпальванне сухіх траў і трысця заўсёды адбываецца за кошт прыроды, а бывае, што гінуць і самыя падпальшчыкі.

Вясна з'яўляецца найбольш абаяльнай парой года. Пасля доўгага зімовага сну да жыцця прабуджаецца ўся прырода. Зімовая шэрасць уступае месца ўзрыву колераў, вырастае аптымізм і надзея. Звярына і птаства займаюцца расплодам і вывадам новага пакалення. Вясна нясе столькі любові ў свеце прыроды, што і чалавек набірае больш бадзёрасці. І ўсё было б добра, калі б не бязглуздзіца ці нястача ўяўлення.

Вельмі часта сярод сакавітай зелені агромныя прасторы прыкрывае сумная, жалобная чарната. Вытокам гэтага рэдкага ў прыродзе колеру з'яўляецца галоўным чынам выпальванне траў. Гэтая праблема вяртаецца кожны год ранняй вясной, калі прымае масавы характар і прычыняе найбольш шкод, і пасля звязення ўраджаю, калі выпальваюцца пакінутыя камбайнамі высокія пожні.

Веснавое выпальванне сенажацей выводзіцца з эпохі экстэнсіўнага гаспадарання. У мінулым, да меліярацыі, выпальванне запыняла разрастанне кустоў і паскарала рост зялёнай травы. Сёння веснавое некантраляванае выпальванне сухіх траў часта абарочваецца ў пажары, да якіх тушэння выклікаюцца пажарнікі. Ад полымяў сярод траў займаюцца палявыя кусты, а на тарфяных лугах загараюцца падзямельныя залежы, якія вельмі цяжка пагасіць. Выпальванне траў часта таксама прыводзіць да пажараў суседніх лясоў. Усё гэта прычыняе шкоды жывой прыродзе: гіне многа малой звярыны — насякомых, птушак, грызуноў, але і буйнейшая жывёла траціць свае логавішчы.

Найсумнейшае, аднак, тое, што ў выніку падпальвання траў штогод гінуць там людзі. Манія падпальвання траў ахапіла ўсіх, без увагі на ўзрост; робяць гэта і падросткі, і старэчы з кастылямі. І менавіта старыя людзі, калі агонь буйнее, кідаюцца ў паніку і намагаючыся загасіць узніклы пажар чадзеюць або дастаюць інфаркт і гінуць у агні; такія трагічныя падзеі здарыліся ў мінулых гадах м.інш. у Арлянскай гміне.

Асцярогі пажарнікаў, паляўнічых і леснікоў не трапляюць да грамадства. Праблема паўтараецца вясной са знішчальнай сілай. І пытанне, дакуль гэта будзе доўжыцца, астаецца без адказу. Не пужае людзей і прадбачваемая законам адказнасць.

Міхал Мінцэвіч

Купецкая кемлівасць

Намовіў мяне зяць зрабіць закупку на раты ў сепермаркеце „Liroy Merlin". Прачытаў я рэкламную лістоўку, пацікавіўся таварамі і цэнамі. Неабходныя мне рэчы каштавалі б каля трох тысяч злотых. Адправіўся я ў Беласток. З афармленнем крэдыту не было клопатаў. Прад'явіўшы пашпарты і пасведчанне аб велічыні пенсіі канторшчыца заявіла: „Можаце ісці і выбіраць тавар". Падборка заняла для мяне за дзве гадзіны часу. Кожны прадавец дапісваў да спіска свой тавар, пры чым уводзіў яго ў камп'ютэр. Пасля вярнуўся я ў кантору. Усю маю пакупку паставілі на закрыты склад, адкуль мне падвезлі для загрузкі. І тут выявілася, што кладаўшчыкі памыліліся. Не хапала дзвюх упаковак шлангаў і ліста пліты для пакрыцця даху. Калі заявіў я аб нястачы, дык сказалі мне, што памыліліся на складзе, але і так тавар праверылі б пры выездзе. Так яно і было. З закупкі я задаволены, бо праз дзесяць месяцаў буду плаціць рату каля 300 зл. Вось што значыць купецкая кемлівасць і выхад насустрач кліенту.

Уладзімір СІДАРУК

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Мяў, злізаў усю смятану...

Паблытаныя мовы

Ад нейкага часу ў лесе мядзведзя Сандара Жоржавіча ніхто з нікім не мог паразумецца. І справа не ў розніцы ў поглядах. Горш. Ні адзін звер не разумеў слоў іншага, кожны прамаўляў на толькі яму аднаму зразумелай мове. Як і тады, калі вавёрка Кацюша з уселяснога кіраўніцтва сустрэла на ўзлеску лань Гаўрусіху.

— Цю-цю-цю! Ту-ту-ту! — кінула на прывітанне вавёрка.

Ашарашаная лань вылупілася на Кацюшу. Прабавала дапяць, чаго тая хоча. Аднак з Гаўрусіных губак таксама вылузаліся нейкія рваныя гукі, якіх не магла зразумець нават яна сама.

— Грдытуфу, абы туфурдыту.

Кацюша і Гаўрусіха паглядзелі на сябе з жахам. Зрокам удакладнілі, што гэта ўсё трэба будзе растлумачыць на сходзе ўселяснога кіраўніцтва.

Мядзведзь склікаў сход праз тыдзень. Пры яго ўваходзе на паляну запанавала асаблівая ціш.

— Вітаю, — пачаў Сандар.

Ніхто, аднак, не азваўся. Кіраўніцтва крадком спазірала сябра на сябра.

— Ну, што гэта такое, на яснага лесуна?! — знерваваўся Жоржавіч.

Кіраўніцтва далей ні „бэ", ні „мэ", а, дакладней, „ні прывета, ні атвета", значыцца, „ні так, ні сяк", а яшчэ іначай „ні то, ні сё".

Мядзведзь падышоў да Свіналыча, які стаяў найбліжэй.

— Ну, што?! Гаварыць мне тут нашым голасам!

Дзік апусціў лыч. Хрумкнуў толькі неяк дзіўнавата. Быццам „угр-р-р". І не прамовіў. Спрабавала прыйсці яму з дапамогай лань Гаўрусіха. З нейкай нясмеласцю падышла бліжэй да мядзведзя. Правай пярэдняй ножкай, дрыготка, накрэсліла на пяску: „Штосьці парабілася, самі не разумеем, што кажам, паблыталіся нам мовы".

Мядзведзь матнуў галавою: зразумеў.

— Гэта, пэўна, нейкая магія, правакацыя тае змяі Ссапіі і вужа Ззянона. Не са мною такое! Я здаўна падрыхтаваў указ на такую чорную гадзіну. Не можа быць, каб наша кіраўніцтва не магло паразумецца адно з адным і з лясною браціяй.

Сандар Жоржавіч з-пад імху, на якім праседжваў найчасцей у час сходаў, дастаў кару з выпісаным заранёў распараджэннем.

— Загадваю на тэрыторыі ўсяго майго лесу абавязкова масава інфармавацца паводле мядзведжага шыхту, дзе „а" гэта „а", „б" гэта „б", і так да „я". Мае быць масава і паасобку. Угу-га!

У кіраўніцтва ўступіў свежы дух. Вавёрцы адразу ўзнялася кіта, лані сталі вушкі, а дзіку выпрасталіся капыты.

— А-ёйку, я зноў прамаўляю нашым голасам, значыць, мовай! — у захапленні крыкнула Гаўрусіха. — Дзякуй вам, наш мішка! Зноў можам масава інфармаваць па-нашаму ўсіх!

— Дзякуй вам, дзякуй! — паўтарала за ланню рэшта кіраўніцтва.

Як заўсёды пасля сходу мядзведзь вярнуўся ў сваю бярлогу, каб падрамаць ад пакутлівага заклінання варожых элементаў. Засынаючы, у думках паўтараў уселясны алфавіт:

— А, бэ, вэ, гэ, дэ... ф-ф-ф...

Заснуў. У сне з'явіліся яму валахатае і страшнае „Сь" і „Зь", якія ўсімі шпарамі ўціскаліся ў бярлогу. Сарваўся ў жаху. Аглянуўся наўкола. Супакоіўся. Зноў прылёг і паўтараў для патолі ад канца: „я, ю, э, шэ, чэ, цэ, хэ-ээ..."

МакХолад

Адгаданка

На Парнасе

(анаграмная шарада)

НЕ ЯЗДА *па громкадроме зіхатлівая...*
А ТВОРЧЫМІ *гасцінцамі яна руплівая!*

(Ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **Н-6, А-9.**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 14 нумара

Пена, лета, сяло, сена, мяжа, Пуцін, рота, клічка, каня, жаданне, Нарач, пыха, аса.

Рашэнне: **Жанчына як марожанае: спачатку халодная, пасля растае і — наканец — ліпне.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Васілю Петручуку** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Міністр да міністра:

— Што табе сказала жонка, калі паведаміў ёй, што пасяджэнне ўрада працягнецца?

— Спытала ціха, ці можа быць у гэтым упэўнена.

* * *

Бландзінка ў лекара:

— Пан доктар, у мяне такі слабы зрок, што нанач трэба накладаць акуляры.

— Чаму?

— Бо ў сне не пазнаю знаёмых.

* * *

Прыходзіць воўк у госці да зайца і бачыць у яго новы тэлевізар.

— Як яго здабыў? — пытае гаспадара.

— Наведаў вавёрку, яна крыху падпіла, распранулася і сказала: „А цяпер бяры што хочаш".

* * *

— Ці гэта праўда, што морква мае карысны ўплыў на зрок?

— Безумоўна, ці хто калі бачыў труса ў акулярах?

VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы.

Тэматыка

Арганізатары не абмяжоўваюць тэматыкі дасыланых твораў. У конкурсе будуць разглядацца працы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў трох узроставых групах:

— I група: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— II група: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас:

Redakcja „Niwy"
ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok 2
skr. poczt. 149

з прыпіскай на канверце: VIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **31 ліпеня 2003 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў канцы верасня 2003 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі грашовыя і рэчавыя ўзнагароды. Дапускаюцца таксама ўсялякія іншыя ініцыятывы арганізацый і прыватных асоб з мэтай павелічэння колькасці ўзнагарод. Арганізатары будуць садзейнічаць такім ініцыятывам.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

3. Журы можа не выкарыстаць усяго фонду ўзнагарод.

4. Арганізатары прадугледжваюць магчымасць публікацыі ўзнагароджаных твораў (без права аўтараў на ганарары) на старонках „Нівы", у агульнапольскім друку і па радыё.

Заключныя заўвагі

1. Працы, якія не адпавядаюць правілам конкурсу, не будуць разглядацца.

2. У справах, якія вынікаюць з супярэчлівага тлумачэння правілаў, канчатковае рашэнне выносяць арганізатары ў паразуменні з журы.

3. Сакратарыят конкурсу змяшчаецца ў:
Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok, tel. 743 50 22

ISSN 0546-1960